Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 192 (5866) | 21 жніўня 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

МОСКВА 19 ... 10 ИН. ТУТ ... ПРАВА

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ:

Перадавы — Ленінская тэорыя, ператвораная ў жыццё.

ДВАЦЦАЦЬ ГОД РАБОТЫ ЛЕНІНА «ГОСУДАРСТВО И РЕВОЛЮЦИЯ»:

М. Міцін — Геніяльнае тварэнне.

Н. Маркаў — Як нараджалася «Государство и революция»

П. Чэрэмных — Соцыялістычная і буржуазная дэмакратыя — 2 стар.

Д. Осіпаў — Фашызм і дзяржава — 3 стар.

Звярнуць кожнаму калгаснику незаконна адрэзаную прысядзібную зямлю. 1 стар.

Да новага навучальнага года:

М. В-ы — Навесці парадак у школах Менскага раёна — 3 стар.

Ад урадавай Камісіі па арганізацыі пералётаў Масква—Паўночная Амерыка.

Гутарка з начальнікам Галоўнага кіраўніцтва паўночнага морскага шляху тав. О. Ю. Шмідтам.

Пошукі самалёта «Н-209».

ЗА РУБЯЖОМ:

Антысовецкая правакацыя японцаў у Шанхаі.

На франтах у Іспаніі. Хваляванні ў лагеры мяцежнікаў.

Праграма адзінства дзеянняў працоўных Іспаніі.

ЛЕНІНСКАЯ ТЭОРЫЯ, ПЕРАТВОРАНАЯ Ў ЖЫЦЦЁ

У жніўні-верасні 1917 года, дваццаць год назад, Ленін напісаў свой геніяльны твор «Государство и революция», твор, увайшоўшы неад'емным каштоўным укладам у скарбніцу марксізма, у яго рэвалюцыйны арсенал. Гэта работа вытрымала найвялікшую жыццёвую праверку з такім бліскучым рэзультатам, як толькі нямногія тварэнні тытанаў чалавечай мыслі.

Выясніць задачы соцыялістычнай рэвалюцыі і яе носьбіта, рабочага класа, у адносінах да дзяржавы — такая была мэта Леніна. Геніяльнымі мазкамі абрысавана ім творчая, усеаслабяняючая роля дзяржавы новага тыпу — дыктатуры рабочага класа. Гэта дзяржава нараджаецца ў агні соцыялістычнай рэвалюцыі, якая разбурае да аснавання старую буржуазную дзяржаўную машыну.

Работа Леніна ўзнікла з надзённейшай патрэбнасці класавай барацьбы. Яна была створана ў кастрычніцкае прадпавальнічча 1917 г. «Пытанне аб дзяржаве набывае ў даны час асаблівую важнасць і ў тэарэтычных і ў практычна-палітычных адносінах», — такавы словы, якімі адкрываецца «Государство и революция». Соцыялістычная рэвалюцыя стукалася ва ўсе дзверы. Ленінскае вучэнне аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў адной краіне дало пролетарыяту ў рукі несакрушальную зброю супроць усіх яго ворагаў — супроць гнуснай і подлай буржуазіі, супроць яе растленных меншавіцка-эсэраўскіх лакеяў, супроць яе гнуснейшых трацкісцка-бухарынскіх прыспешнікаў. Рабочы клас нашай краіны рабіў апошнія падрыхтаванні да штурму цвярдынь капітала.

У гэтай абстаноўцы геній Леніна з крыштальнай яснасцю вызначыў рэвалюцыйныя задачы пролетарыята ў адносінах да дзяржавы. Неабходна разбіць, зламаць стары дзяржаўны апарат, які быў сродкам прыгнечання і гвалту нікчэмнай кучкі эксплаататараў над велізарнымі народнымі масамі. Неабходна стварыць на яго месцы зусім новую ніколі раней небывалую дзяржаву, моцную і магутную нябачанай падтрымкай мільённых мас і іх удзелам ва ўсіх галінах грамадскага жыцця, страшную для ворагаў соцыялізма і блізкую, родную працоўнаму народу. Паміж капіталізмам і комунізмам ляжыць пераходны перыяд, і дзяржавай гэтага пераходнага перыяда можа быць толькі дыктатура рабочага класа. Яна неабходна аж да перарастання перамогшага соцыялізма ў поўны комунізм. Такава ясная і чоткая перспектыва, якая была раскрыта Леніным.

Бессмяротнае тварэнне Леніна вырасла на гранітным фундаменце непераможнай тэорыі Маркса і Энгельса. Ленін аднавіў іх сапраўдныя погляды, аслабаніў чыстую крыніцу іх вучэння ад скрываўшага яго смецця, нагромаджанага скажальнікамі і апашліцелямі марксізма з лагера Другога інтэрнацыянала. Ужо выкананне адной гэтай задачы назаўсёды ўключыла-б твор Леніна ў жалезны інвентар марксісцкай тэорыі. Але гэтым далёка не абмяжоўваецца значэнне «Государства и революции». Ленін не толькі ўзнавіў вучэнне асноваполажнікаў марксізма аб дзяржаве, але і падняў гэта вучэнне на новую, вышэйшую ступень ва ўмовах новай гістарычнай эпохі.

Ён абагуліў гіганцкі гістарычны вопыт рэвалюцыйнай барацьбы рабочага класа ўсяго свету, і перш за ўсё расійскага пролетарыята, кіруемага партыяй большэвікоў. Вопыт парыжскіх комунараў, зрабіўшых першую спробу стварэння дыктатуры пролетарыята, вопыт рэвалюцыйных баёў 1905 г. і 1917 г. у нашай краіне крышталізаваўся ў радках ленінскага аналіза. Ленін распрацаваў і рушыў наперад марксава вучэнне аб пролетарскай дыктатуры. Ён адкрыў советы як дзяржаўную форму дыктатуры рабочага класа. Ён адкрыў вышэйшы прынцып гэтай дыктатуры ў саюзе рабочага класа з асноўнымі масамі сялянства, ствараемым пад кіраўніцтвам рабочага класа з мэтай пабудовы соцыялізма. Ён раскрыў дэмакратычную сутнасць дыктатуры рабочага класа, якая ў мільёны разоў дэмакратычней усякай буржуазнай дэмакратыі.

Ленін пісаў сваю работу ў глыбокім падполлі, адчуваючы на сабе ўсю абмежаванасць і хлуслівасць запозненай расійскай буржуазнай дэмакратыі. Ён жыў у шалашы на станцыі Разліў, скрываючыся ад апрычнікаў Керэнскага, якія мелі прамы загад аб яго забойстве. Прайшло два месяцы, і Ленін устаў на чале першага ў свеце рабоча-сялянскага ўрада, прышпорыўшага да ўлады ў рэзультаце найвялікшай у свеце рэволюцыі. Тэорыя стала ператвараца ў жыццё.

«Выхоўваючы рабочую партыю, — пісаў Ленін у сваёй рабоце аб дзяржаве і рэволюцыі, — марксізм выхоўвае авангард пролетарыята, здольны ўзяць уладу і весці ўвесь народ да соцыялізма, накіроўваць і арганізоўваць новы лад, быць настаўнікам, кіраўніком, правадыром усіх працоўных і эксплаатуемых у справе ўпарадкавання свайго грамадскага жыцця без буржуазіі і супроць буржуазіі». Дыктатура рабочага класа, кіруемая партыяй Леніна—Сталіна, пераўтварыла нашу краіну. Яе цудоўныя творчыя сілы, прадбачаныя Леніным, раскрыліся ва ўсёй сваёй паўнаце. У агні лютай класавай барацьбы соцыялізм перамог беспаваротна. У нечувана кароткі гістарычны адрэзак часу ажыццёўлена перабудова грамадскіх адносін, па сваёй глыбіні і грунтоўнасці не маючая сабе роўнай за ўсім мінулым чалавецтва. На падставе новага, выключна багатага гістарычнага вопыту, у рашучай барацьбе з безлічнымі спробамі скажэння і апашлення прадаўжальнік справы Леніна таварыш Сталін дае далейшае развіццё і ўсебаковую распрацоўку марксісцка-ленінскага вучэння аб дыктатуры рабочага класа, як адзіным шляху да комунізма.

Соцыялізм увасобіў у жыццё імкненне і надзеі лепшых сыноў чалавецтва, перадавых барацьбітоў за яго аслабанене з капцюроў прыгнечання і рабства, жабрацтва і несправядлівасці. Геніяльныя начэртаніі Леніна знайшлі сабе працяг і развіццё ў Сталінскай Канстытуцыі. У ёй увасоблена тэорыя і практыка дыктатуры рабочага класа, пабудаваўшага ў асноўным велічны будынак соцыялізма— першай фазы комунізма.

У Сталінскай Канстытуцыі соцыялістычны дэмакратызм пераліваe ўсімі фарбамі жывой, рэальнай рэчаіснасці. Гэта— самая дэмакратычная канстытуцыя ў свеце. Яе карэнная асаблівасць у тым, што яна не толькі абвяшчае правы, але і гарантуе іх ажыццяўленне. Упершыню ў гісторыі чалавецтва створан лад, забяспечваючы ўсяму працоўнаму народу не толькі фармальныя правы, але і сапраўдную магчымасць іх рэалізацыі. Працоўныя масы раз назаўсёды вызвалены ад ярма эксплаатацыі, ад жабрацкай торбы, ад давячай няўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Вялікая хартыя правоў—на працу, на адпачынак, на асвету, на забяспечаную старасць — шырока адкрыла перад усімі чэснымі тружанікамі дарогу да заможнага і культурнага жыцця. Гэта — заваяванні, свяшчэнныя для ўсяго перадавога чалавецтва. Калі совецкі народ бязлітасна знішчае трацкісцка-бухарынскіх і іншых пасланцоў крывавага фашызма, злачыннай рукой пасягаючых на гэтыя зазаяванні, ён сустракае поўнае разуменне і адабрэнне чэсных абаронцаў дэмакратыі ва ўсім свеце.

Непагасным маяком соцыялістычнай дэмакратыі, сапраўднай свабоды і прагрэсу высіцца наша краіна над усім светам. Яе грамадскі і дзяржаўны лад, гераічныя подвігі яе сыноў прыцягваюць жывейшыя сімпатыі ўсяго чэснага чалавецтва. Росквіт соцыялістычнага дэмакратызма ў СССР надае новыя сілы шчырым прыхільнікам дэмакратыі ва ўсім свеце. Расце і шырыцца сусветны фронт супроць нечуваных злачынстваў фашызма, супроць вайны, супроць фашысцкага ізуверства, пагражаючага сперці з твару зямлі найвялікшыя каштоўнасці чалавечай культуры.

Сталінскі Цэнтральны Камітэт і совецкі ўрад цвёрда і ўпэўнена вядуць нашу краіну да новых перамог комунізма. І няма той сілы ў свеце, якая магла-б спыніць яе непераможны марш.

Звярнуць кожнаму калгаснику незаконна адрэзаную прысядзібную зямлю

ВЫПРАВІЦЬ ПАМЫЛКІ

Асобныя раёны Мозырскай акругі несур'ёзна аднесліся да надзялення калгаснікаў прысядзібнымі ўчасткамі. У Ельскім, Жыткавіцкім і Нараўлянскім раёнах, у правядзенні гэтай важнейшай работы дапушчана шмат памылак.

Па зводках, якія маюцца ў акруговым зямельным аддзеле, 714 калгаснікам Нараўлянскага раёна, патрэбна данарэзаць прысядзібныя ўчасткі, а данарэзалі ўсяго 572 калгаснікам. Тут ёсць намеры недарэзаць калгаснікам той колькасці зямлі, якую яны мелі раней, хоць плошча яе не правышала максімальнай нормы. Напрыклад, у 1934 годзе калгаснік сельгасарцелі «Колас Кастрычніка», Міхалкоўскага сельсовета, Касуха, меў 0,40 гектара прысядзібнага ўчастка, а зараз яму нарэзалі 0,30 гектара. Касуха некалькі разоў хадзіў скардзіцца ў райземаддзел і нічога не дабіўся.

Як выявілася, зараз у Ельскім раёне аказалася да 300 калгасных гаспадарак, якія не маюць нават мінімальнай нормы прысядзібы.

У Жыткавіцкім раёне з 400 гектараў на прысядзібныя ўчасткі калгаснікам адвялі толькі 83. Па калгасах Юркевіцкага сельсовета ў прысядзібныя ўчасткі калгаснікам умудрыліся ўлічыць і двары з жылымі будынкамі. Аб гэтым было паведамлена райвыканкому і райземаддзелу. Але ніхто з іх не задумваўся над тым, каб выправіць дапушчаную памылку.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што ў Мозырскай акрузе ў рабоце па надзяленню калгасных гаспадарак сядзібамі дапушчаны вялікія памылкі, якія неабходна выправіць у бліжэйшыя дні. Трэба выявіць кожную гаспадарку, у якой незаконна абрэзан прысядзібны ўчастак і звярнуць гэту зямлю.

С. ЗАЙЦАЎ.

ВЫКАНАЦЬ ПАСТАНОВУ СНК СССР І ЦК ВКП(б)

У 1929 годзе аднаасобнікі пасёлкаў «Культура» і «Піч». Дудзіцкага сельсовета (Смілавіцкі раён), аб'ядналіся ў калгас імя Комвуза Беларусі. К таму часу кожны з калгаснікаў меў прысядзібны ўчастак па 0,75 гектара. Такімі сядзібамі яны карысталіся да 1935 года.

У 1935 годзе сядзібы былі абрэзаны да 0,33 га. Гэта было зроблена па-шкодніцку, незаконна, бо згодна пастановы НКЗ СССР і Сельгасаддзела ЦК ВКП(б) для калгаснікаў Смілавіцкага раёна максімальная норма прысядзібных участкаў вызначана ў 0,60 гектара, значыць калгасны двор можа мець прысядзібны ўчастак у размеры да 0,60 га.

Пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў калгасным упарадкаванні» калгаснікі сустрэлі з вялікай радасцю. Яны, у прыватнасці, спадзяваліся, што ім будзе звернута незаконна адрэзаная зямля.

Але, як відаць, у Смілавічах гістарычную пастанову партыі і ўрада не разумеюць. У дарэзцы сядзіб калгаснікам адмовілі. У сельсовет і калгас прыязджалі прадстаўнікі раённых арганізацый. На скаргу калгаснікаў яны па чыейсьці ўказцы адказалі:

— Раз калгас два гады карыстаецца гэтай зямлёй, вярнуць яе калгаснікам нельга. Калгаснікі маюць прысядзібныя ўчасткі па 0,33 гектара, гэта больш вызначанага законам мінімума, і таму дарэзваць не будзем.

Гэта не адзінае скажэнне гістарычнай пастановы партыі і ўрада ў Смілавіцкім раёне. Ёсць факты, калі некаторым калгаснікам сядзібы паразаюцца не каля іх двароў, а воддаль — на палявых землях калгаса.

Скажэнні Сталінскага закона неадкладна павінны быць выпраўлены.

С. РУНЦО.

ВЫШЭЙ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

Байцы і камандзіры Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі № школы, абмеркаваўшы на агульным сходзе пастанову СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б), у свазім пісьме да беларускага калгаснага сялянства пішуць:

«Мы, сыны беларускага народу, стаім на абароне заходніх рубяжоў нашай радзімы ад азвярэлых кровежадных драпежнікаў—фашыстаў. Сваю грозную большэвіцкую зброю мы трымаем моцна і непахісна.

— Беларускі народ, сынамі якога з'яўляемся мы, ніколі і нікому не дазволіць адарваць Совецкую Беларусь ад вялікага СССР. Беларускі народ пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і правадыра працоўных таварыша Сталіна змагаўся за вызваленне БССР ад белапольскай акупацыі. Пад кіраўніцтвам партыі і таварыша Сталіна беларускі народ змагаецца за пабудову бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Мы запэўняем партыю і вялікага Сталіна, што пад непасрэдным кіраўніцтвам бліжэйшага яго саратніка любімага наркома абароны таварыша Варашылава мы не пашкадуем ні сваіх сіл, ні свайго жыцця для абароны і ўмацавання перамог вялікай соцыялістычнай рэволюцыі. Мы яшчэ больш узмоцнім работу над вывучэннем сваёй баявой тэхнікі, над авалоданнем большэвізмам і яшчэ мацней згуртуемся вакол партыі Леніна—Сталіна і правадыра ўсіх працоўных таварыша Сталіна».

* * *

«Ніякія шкодніцкія дзеянні ворагаў не могуць спыніць будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне, — пішуць у рэзалюцыі агульнага схода калгаснікі сельгасарцелі «Штурмавец», Шастакоўскага сельсовета (Копыльскі раён).—Той, хто паімкнецца напасці на нашу шчаслівую зямлю вялікага Совецкага Саюза, паложыць сваю галаву ад знішчальнага ўдару нашай любімай Чырвонай Арміі.

Мы, калгаснікі, з яшчэ большай энергіяй будзем змагацца за ўмацаванне абароназдольнасці нашай радзімы, за большэвіцкія калгасы, за высокі ўраджай і заможнае жыццё. Асеннюю сяўбу правядзем не больш, як за 7 дзён. Высока паднімем кошт працадня ў калгасе».

* * *

У адказ на пастанову комуністычнай партыі і совецкага ўрада будзем мацаваць нашы калгасы, да канца выкрываць усіх гадаў, якія шкодзілі і шкодзяць у нашым калгасным жыцці, — заявіў на сходзе ў сельгасарцелі «Пуцілавец», Камсеніцкага сельсовета (Крутлянскі раён) калгаснік Ражкоў Нікіфар.

Калгас яшчэ да 10 жніўня скончыў уборку зернавых на плошчы 187 гектараў і выканаў абавязковыя паставкі збожжа дзяржаве.

Л. АНДРАБАЙКА.

ГРУБАЕ ПАРУШЭННЕ ПАСТАНОВЫ

На сходзе ў калгасе «Чырвоная зорка», Шчадрынскага сельсовета (Парыцкі раён) прадстаўнік райкома КП(б)Б тав. Несцюк даў такую ўстаноўку — абмяраць і наразаць прысядзібныя ўчасткі такімі, якімі яны былі да калгаса, але ў размеры ад 0,35 да 0,60 гектара.

Колькі-ж дакладна кожны калгасны двор павінен атрымаць зямлі — невядома. Аб гэтым ім нават ніхто нічога не гаворыць.

Пачалося надзяленне калгасных гаспадарак прысядзібнымі ўчасткамі. Старшыня праўлення Пішчала надзяленне прысядзібнымі ўчасткамі калгаснікаў даручыў брыгадзірам.

Брыгадзіры ў гэтай справе творыць яўнае злачынства. Свайму свату або куму яны адмяраюць 0,60 гектара, а другім па 0,30 — 0,20 і нават 0,10 гектара.

У другой брыгадзе комсамольцы—брыгадзіру трактарнай брыгады Шчадрынскай МТС тав. Хорт Мані, у якой на ўтрыманні 4 непрацаздольных дзяцей, далі 0,10 гектара, бо яе бацька меў да ўступлення ў калгас таксама 0,10 гектара.

Усё гэта стварыла нездаровыя настроі ў калгасе. Брыгадзірам падхалімнічаюць, стараюцца ўгадзіць ім, бо інакш прысядзібная ўчастка, які паложан па закону, не атрымаеш.

Старшыня сельсовета Дудко разам з старшынёй праўлення калгаса Пішчала не толькі не забяспечылі правядзенне пастановы партыі і ўрада ў жыццё, але пасутнасці сталі на шлях антыдзяржаўных дзеянняў.

Раённыя арганізацыі ведаюць аб гэтым, але ніякіх мер не прымаюць. Інструктар райкома КП(б)Б Бурнэйка часта бывае ў калгасе, аднак на скаргі калгаснікаў ён не звяртае ўвагі. КАЛГАСНІК.

УЗМАЦНІЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ

Пры абмеркаванні пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) у вёсны Зажэвічах (Старобінскі раён) аднаасобнік Грамека Валодзя заявіў:

— Наша комуністычная партыя і совецкі ўрад аказалі вялікую дапамогу сялянству. Для аднаасобнікаў, якія ўступаюць у калгас, даны новыя ільготы. У адказ на клопаты і дапамогу нашага роднага бацькі таварыша Сталіна я падаю заяву ў калгас.

На гэтым-жа сходзе падалі заявы аб прыёме ў калгас аднаасобнікі Ефімчык Іван і Ефімчык Нікалай.

У Доўгаўскім сельсавеце ўступілі ў калгас аднаасобнікі Рудзеня Адам і Міхназец.

Аднак трэба адзначыць, што вялікі ўздым працоўных аднаасобнікаў у Старобінскім раёне не ўзначалены партыйнымі і совецкімі арганізацыямі.

К. ГРАМАКОЎСКІ.

ШЫРОКА РАЗГОРТВАЦЬ САМАКРЫТЫКУ

Калгаснікі сельгасарцелі імя Кагановіча і аднаасобнікі вёсак Кавалеўшчына і Чыжоўка, Мардашэвіцкага сельсовета (Дубровенскі раён) у рэзалюцыі схода пішуць:

«Мы запэўняем нашу слаўную комуністычную партыю, наш рабоча-сялянскі ўрад і правадыра народаў таварыша Сталіна, што беларускае сялянства—усе як адзін у выпадку нападу ворага стануць на абарону сваёй вялікай дарагой радзімы. Сваёй адданай і чэснай работай зробім калгасы непрыступнай крэпасцю абароны. Шырока разгорнем крытыку і самакрытыку, узнімем рэволюцыйную пільнасць, каб да канца выкарчаваць шкодныя дзеянні ворагаў у калгасах.

Шкодніцкія акты ў нашым калгасе праводзіліся з мэтай разбурыць соцыялістычную гаспадарку. Прысядзібныя ўчасткі калгасным гаспадарам даваліся за кілометр ад хаты, а былым кулакам — у цэнтры калгаснай сядзібы.

Адказнасць за гэта шкодніцтва нясуць у першую чаргу былыя старшыні калгаса Вазміцель Гаўрыла, Прудзікаў Астап, а таксама былыя кіраўнікі раёна».

Па даручэнню схода:

А. ВАЗМІЦЕЛЬ, ШЧАРБЯНОК, ПАХОМЕНКА, НЕРОДА.

АД УРАДАВАЙ КАМІСІІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПЕРАЛЁТАЎ МАСКВА—ПАЎНОЧНАЯ АМЕРЫКА

Лётчык Задкоў на гідраплане «СССР Н-2» 20 жніўня прыляцеў на мыс Бароў на Аляскі, адкуль пачне рошукі самалёта «Н-209».

Ледакол «Красін» знаходзіцца за 10 міль ад мыса Бароў, стаіць у дзесяцібальным ільду, чакаючы спынення туману для далейшага руху.

Набыты ў Амерыцы гідраплан «СССР Л-2» пад камандаваннем Вілкінса пераляцеў з Нью-Ёрка ў Порт Артур (у Канадзе ля возера Верхняга).

Закончана заводская падрыхтоўка трох самалётаў «АНТ-6» у Маскве. На 21 жніўня назначаюцца пробныя палёты перад вылетам экспедыцыі ў Арктыку.

У складзе экспедыцыі Героі Совецкага Саюза тт. Шавелеў (начальнік экспедыцыі), Валап'янаў (камандзір атрада і камандзір самалёта «Н-170»), Молакаў (камандзір самалётаа «Н-171»), Алексееў (камандзір самалёта «Н-172»), Спірын (флаг-штурман). Экіпажы самалётаў у асноўным складаюцца з удзельнікаў экспедыцыі па Паўночны полюс. (БЕЛТА).

ГУТАРКА З НАЧАЛЬНІКАМ ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА ПАЎНОЧНАГА МОРСКАГА ШЛЯХУ т. О. Ю. ШМІДТАМ

Адсутнасць радыёсувязі з самалётам «СССР Н-209» тав. Леванеўскага, а значыць, невядомасць месца яго пасадкі, робіць рошукі яго аперацыяй выключна труднай, у асаблівасці ва ўмовах восені. Таму, для поспяху аперацыі патрабуецца вялікі маштаб работы.

Совецкі ўрад у часе выратавання экспедыцыі Нобіле ў 1928 годзе і экспедыцыі «Челюскина» ў 1934 годзе кінуў на пошукавыя і выратоўчыя работы велізарныя сілы, якія забяспечылі поўны поспех гэтых аперацый. Таксама і ў даным выпадку ўрад прадаставіў камісіі па арганізацыі пералётаў неабмежаваныя матэрыяльныя і грашовыя сродкі. Непасрэднае кіраўніцтва пошукавымі аперацыямі ўрадавая камісія ўсклала на Галоўнаўночмаршлях і асабіста на мяне.

Усяго на пошукавыя работы ўрашана 9 вялікіх самалётаў (чатырохматорных і двухматорных) і шэсць аднаматорных самалётаў — дапаможных. У гэты лік уваходзяць чатырохматорныя самалёты «АНТ-6» — удзельнікі пералёту на Паўночны полюс. Адзін з іх (лётчыкаў Мазурука і Казлова) знаходзіцца на в. Рудольфа. Аднак, мы не лічым мэтазгодным яго ізалявана пасылаць на рошукі, бо поспех больш забяспечан, калі паляніць вялікі атрад, які разам ахопіць поглядам шырокую паласу ільду (да 100 клм. шырынёй). Тры другія самалёты гэтага тыпу заканчваюць падрыхтоўку ў Маскве і ў бліжэйшыя дні вылецяць на востраў Рудольфа, а адтуль — на станцыю «Паўночны полюс».

Адначасова арганізуюцца рошукі ў амерыканскім сектары. Ужо набыт у Амерыцы вялікі самалёт «Кансалідэйтэд» тыпу лятаючай лодкі, які аказаўся цалкам падрыхтаваным для экспедыцыі на Новую Гвінею, але пераўступлен нам. Гэта—адзін з лепшых навейшых самалётаў з двума магутнымі маторамі па адной тыс. сіл. коштам 230 тыс. даляраў. На гэтым самалёце, атрымаўшым апазнавальныя знакі «СССР Л-2», паляніць вядомы даследчык Вілкінс і група лепшых палярных лётчыкаў Канады і ЗША. Совецкі ўрад прыняў таксама прапанову вядомага лётчыка Матэрна і фінансуе яго палёты. Уся падрыхтоўка палётаў з боку Амерыкі сканцэнтроўваецца ў паўпрэдстве СССР у тав. Уманскага, у распараджэнне якога на расходы першага перыяда пераведзена 125 тыс. даляраў.

У Амерыку-ж прыбыў прыляцеўшы з Охоцка совецкі двухматорны гідрасамалёт «СССР Н-2» лётчыка Задкова. На дарозе з заходняга сектара Арктыкі ва ўсходні знаходзяцца вялікія самалёты «СССР Н-206» і «СССР Н-207», а аднаматорныя самалёты размешчаны часткаю на ледаколе «Красін» (недалёка ад мыса Бароў на Аляскі), часткаю на востраве Рудольфа.

Падрыхтоўка ўсіх экспедыцый вядзецца ўзмоцненымі тэмпамі. Аднак, мы лічым, што лепш патрацінь лішні дзень на больш дэтальны агляд самалёта і яго абсталявание, але затое ў Арктыцы быць ва ўсеўзбраенні для хуткага правядзення аперацый. (БЕЛТА).

ПОШУКІ САМАЛЁТА „Н-209"

МАСКВА, 20 жніўня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення Галоўнаўночмаршляху, лётчык Задкоў на двухматорным гідрасамалёце «СССР Н-2» 20 жніўня ў 19 гадзін па мясцоваму часу пляцеў з Уэлена праз Берынгаў праліў на мыс Бароў (паўночны пункт Аляскі). Імкнучыся хутчэй пачаць пошукі самалёта «Н-209», Задкоў зрабіў свой пералёт сёння, не гледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я.

Амерыканскі і канадскі ўрады далі дазволы на палёты Задкова над тэрыторыямі гэтых краін.

УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ПА СЕВАЗВАРОТУ

7 верасня Акадэмія сельскагаспадарчых навук імя Леніна склікае ўсесаюзную нараду, прысвечаную абмеркаванню праекта камісіі Наркамзема СССР і Наркамсоўгасаў СССР «Аб увядзенні правільных севазваротаў».

У нарадзе прымуць удзел каля 200 вучоных, работнікаў зямельных органаў і соўгасаў.

Будуць заслуханы даклады акадэміка В. Р. Вільямса, Д. Н. Пранішнікава, І. В. Якушкіна і інш. (БЕЛТА).

ДОЖДЖ І ТУМАН НАД ПОЛЮСАМ

Каардынаты палярнай станцыі «Паўночны полюс» за прайшоўшыя двое сутак не змяніліся. 19 жніўня ў 13 гадзін крыга знаходзілася на 87 град. 08 мін. шыраты і на 2 град. усходняй даўгаты.

Над станцыяй туман, імжыць дожджж. Па-ранейшаму дуе ўсходне-і паўднёва-ўсходні вецер, які ўзмацніўся да 4 балаў. Бачнасць 200—500 метраў. Тэмпература 0 градусаў. (БЕЛТА).

ЗАКРЫЦЦЁ КОНСУЛЬСТВАЎ СССР Ў ПАГРАНІЧНАЙ І САХАЛЯНЕ

ХАБАРАЎСК, 16 жніўня. (БЕЛТА). Тут атрыманы весткі, што 13 жніўня кіраўнік генеральнага консульства СССР у Харбіне тав. Кузнецоў, па даручэнню совецкага ўрада, заявіў асоба ўпаўнаважанаму манчжурскага дэпартамента замежных спраў у Харбіне пратэст супроць абураючага рэжыма, створанага японо-манчжурскімі ўладамі для совецкіх консульстваў у Манчжурыі, і паведаміў аб рашэнні совецкага ўрада закрыць совецкія консульствы ў Пагранічнай і Сахаляне.

У СОЎНАРКОМЕ САЮЗА ССР

АБ ПАРАДКУ СПАГНАННЯ З КАЛГАСАЎ НЯЗДАНАЙ У ТЭРМІН НАТУРАПЛАТЫ РАБОТ МТС

Совет Народных Камісараў Саюза ССР скасаваў бясспрэчны парадак спагнання з калгасаў нязданай імі ў тэрмін натураплаты работ МТС, устанавіўшы, што гэта натураплата спаганяецца машынна-трактарнай станцыяй з калгаса праз народны суд, незалежна ад сумы іску.

Калі пры разглядзе справы ў народным судзе выявяцца даныя, якія ўказваюць на злосны характар нязданай натураплаты, суд адначасова з рашэннем аб спагнанні з калгаса натураплаты перадае справу пракурору для расследвання.

У выпадку перадачы пракурорам справы ў суд для прыцягнення праўлення калгаса да адказнасці за злосную нязданую натураплаты, суд, устанавіўшы наяўнасць злоснасці, накладае на калгас грашовы штраф у размеры паловы кошту нязданай натураплаты па цэнах, устаноўленых для абавязковых паставак дзяржаве. (БЕЛТА).

ПІСЬМО ПАВЕРАНАГА У СПРАВАХ ЗША Ч. В. АБ. НАРОДНАГА КАМІСАРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ СССР тав. ПАЦЁМКІНУ

Паверана ў справах ЗША ў СССР пан Лой В. Гендэрсон звярнуўся 17 жніўня да ч. в. аб. народнага камісара замежных спраў СССР тав. В. П. Пацёмкіна з пісьмом, у якім выказаў надзею, што тав. Леванеўскі і ўвесь экіпаж самалёта «Н-209» будуць хутка па-за небяспекай і змогуць прадаўжаць сзае гераічныя доследы ў Арктыцы. (БЕЛТА).

ТЭЛЕГРАМА БАСКСКІХ ФУТБАЛІСТАЎ

МАСКВА, 20 жніўня. (БЕЛТА). Баскія футбалісты, гасцюўшыя ў СССР, прыслалі ва Ўсесаюзны камітэт па справах фізкультуры і спорту пры СНК СССР наступную тэлеграму:

«Перш чым пакінуць цудоўную совецкую краіну, мы зноў шлем камітэту выражэнне нашай глыбокай падзякі і ўсхваляванае прывітанне ўсім совецкім спартсменам».

20 ГОД РАБОТЫ ЛЕНІНА „ГОСУДАРСТВО И РЕВОЛЮЦИЯ“

* * *

Як нараджалася „Государство и революция“

Кніга Леніна з'яўляецца прадаўжэннем і развіццём лініі, якую ў пытаннях аб дзяржаве і дыктатуры пролетарыята праводзіў большавізм на працягу ўсёй сваёй гісторыі ў барацьбе з усякага роду зарожымі напрамкамі. Гэта кніга — вынік аналіза і ўліку вопыту гістарычнага руху найшырэйшых народных мас пад кіраўніцтвам рабочага класа, які меў месца ў нашай краіне ў перыяд рэволюцый 1905 і 1917 гг.

Ужо ў сваіх ранніх работах сярэдзіны 90-х гадоў мінулага века, накіраваных супроць народнікаў і «легальных марксістаў» (Струве, Булгакоў), Ленін вядзе барацьбу за сапраўды марксісцкае разуменне класавай прыроды дзяржавы. Ён выкрывае ліберальнае народніцтва, якое зварачалася да існаваўшай прыгонніцка-самадзяржаўнай дзяржавы з патрабаваннем усякага роду рэформ і паляпшэнняў. З усёй сілай сваёй рэволюцыйнай страсці Ленін выкрывае адкрыта-буржуазную трактоўку дзяржавы, якую праводзіў у сваіх работах гэтага перыяда ідэолаг ліберальнай буржуазіі, зіднейшы прадстаўнік «легальнага марксізма» Струве, які разглядаў дзяржаву як «арганізацыю парадку».

Пытанне аб дзяржаве і дыктатуры пролетарыята ўстае затым перад ІІ з'ездам партыі, пры распрацоўцы праграмы партыі. Як вядома, Плеханаў у адным з належачых яму праектаў праграмы замяніў разуменне дыктатуры пролетарыята разуменнем — завяванне палітычнай улады пролетарыятам. На першы погляд магло здавацца (так уяўляў справу Плеханаў), што гэта пытанне не мае істотнага значэння і што спрэчка больш тэрміналагічнага парадку, чым па сутнасці.

Ужо ў адным факце выступлення Леніна супроць гэтай фармуліроўкі Плеханава ярка выразілася барацьба Леніна за партыю новага тыпу, за сапраўды марксісцкую, большавіцкую лінію ў пытаннях класавай барацьбы. Характэрна, што ні ў адной з праграм партый Другога інтэрнацыянала няма патрабавання пролетарскай дыктатуры, няма нават разумення дыктатуры пролетарыята. У Эрфурсцкай праграме германскай сацыял-дэмакратыі ёсць усё тое-ж прэславутае палажэнне аб «казаваянні палітычнай улады пролетарыятам». Толькі праграма расійскай сацыял-дэмакратыі, пад уздзеяннем Леніна і ў выніку яго барацьбы з усякімі спробамі адыходу ад рэволюцыйнага марксізма і ў гэтым галоўнейшым пытанні, абвяшчала задачу барацьбы за дыктатуру пролетарыята.

Пытанне аб адносінах рэволюцыі да дзяржавы як у тэарэтычным, так і ў практычным сэнсе стала затым у ходзе рэволюцыйных падзей 1905 года. Уздым рэволюцыйнай барацьбы найшырэйшых народных мас пад кіраўніцтвам пролетарыята ў 1905 годзе пастазіў практычна пытанне аб адносінах да самадзяржаўнай, бюракратычнай, памешчыцка-буржуазнай дзяржавы. Гэты-ж масавы рух нараздзіў таксама і новую форму класавай барацьбы пролетарыята — советы рабочых дэпутатаў. Вакол пытання аб ролі і значэнні советаў, гэтай новай формы класавай барацьбы, народжанай ініцыятывай мас у агні і віхры рэволюцыйных падзей, разгортваецца вострая барацьба большавікоў з меншавікамі.

Спрэчкі аб ролі і значэнні советаў ужо тады былі звязаны з пытаннем аб дыктатуры. Большавікі, пад кіраўніцтвам Леніна, паставілі пытанне аб рэволюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры пролетарыята і сялянства. Меншавікі-ж адносіліся вельмі адмоўна да лозунга дыктатуры. Большавікі ўказвалі, што советы фактычна з'яўляліся зародышамі рэволюцыйнай улады. Меншавікі-ж ніяк не хацелі лічыць іх зачаткамі рэволюцыйнай улады і самым катэгарычным чынам адвяргалі лозунг дыктатуры пролетарыята.

Ленін пісаў: «... Атрымаўся такі факт, што тыя асноўныя пытанні (совецкая ўлада і дыктатура пролетарыята), якія займаюць цяпер увагу свядомых рабочых ва ўсім свеце, аказаліся пастаўленымі практычна ў канцы 1905 года». Прынцыповая грань, якая аддзяляла пролетарскую большавіцкую лінію ад буржуазнай ліберальна меншавіцкай, поўнасцю сказалася ў пытанні аб ролі і значэнні советаў.

Пытанне аб дзяржаве і дыктатуры пролетарыята ўстае зноў з асаблівай вастрынёй у перыяд імперыялістычнай вайны. Велізарныя падзеі патраслі ўвесь свет. У агні і грукаце сусветнай бойкі распаўся ІІ інтэрнацыянал. Социял-шавіністы розных краін заўзята выконвалі заданні сваіх імперыялістычных гаспадароў.

Геніяльны правадыр рабочага класа ясна бачыў набліжэнне каласальных рэволюцыйных патрасенняў і няўхільна каваў ідэйную зброю для надыходзячых боек. У 1915 годзе — у барацьбе з Іудушкай-Троцкім — Ленін абгрунтаваў вялікую ісціну аб магчымасці перамогі социялізма у адной краіне.

У адным са сваіх пісем, якія адносяцца да верасня 1916 года, Ленін выказваў думку аб неабходнасці глыбокай тэарэтычнай распрацоўкі пытання аб дзяржаве і дыктатуры пролетарыята ў сувязі, з аднаго боку, з неабходнасцю выкрыцця апартуністаў па гэтаму пытанню і, з другога, у сувязі з хістаннямі думкі, якія заўважаліся ў некаторых замежных гуртках нашай партыі. Ленін меў на ўвазе погляды аб дзяржаве прадстаўніка так называемага «імперыялістычнага эканамізма» Пятакова, а таксама Радэка, якія яны развівалі ў дыскусіі аб праве нацый на самавызначэнне. Гэтыя палітычныя прахадзімцы, здраднікі нашай социялістычнай радзімы, агенты фашызма, ужо ў той перыяд, больш дваццаці год назад, выказвалі пагарду да задачы стварэння социялістычнай дзяржавы, адмаўлялі яго неабходнасць і «даказвалі», што социялістычная дзяржава зусім непатрэбна пролетарыяту. Укупе з імі, падзяляючы цалкам іх пазіцыі, тады-ж выступіў Бухарын са сваёй анархісцкай тэорыйкай «узрыву» дзяржавы, з процістаўленнем Леніну сваёй, варожай марксізму лініі.

Усе гэтыя акалічнасці таго перыяда прымусілі Леніна ўпчыльную заняцца распрацоўкай пытання аб дзяржаве. У канцы 1916—пачатку 1917 года Ленін прыступіў да збірання матэрыялаў. К моманту Лютаўскай рэволюцыі ў Леніна быў амаль гатоў увесь матэрыял для яго работы. «Государство и революция», нават быў складзен яе план. Аднак напісаць кнігу тады не ўдалося, бо рэволюцыйныя падзеі ў Расіі прымусілі эдсунуць на другі план тэарэтычную работу.

Лютаўская рэволюцыя прыкавала ўсю ўвагу Леніна к задачам бягучай рэволюцыйнай барацьбы, затрымала на некаторы час канчатковую апрацоўку сабранага і сістэматызаванага матэрыялу. Гэтыя матэрыялы, у выглядзе заметак і выпісак, аб'яднаныя Леніным пад агульнай назвай «Марксизм о государстве», сабраны ў вядомым «сінім сшытку», якому сам Ленін налаваў выключнае значэнне. Гэты «сіні сшытак» у часе пераезду Леніна з эміграцыі ў Расію «затрымаўся ў Стакгольме», і толькі пасля ліпеньскіх дзён 1917 г., калі Ленін скрываўся ў шалашы на станцыі «Разліў», ён выграбаваў яго да сябе і на аснове сабраных у ім матэрыялаў стаў пісаць «Государство и революция». Кнігу ён скончыў у Фінляндыі, у Гельсінгфорсе.

Ленін надаваў гэтай рабоце выключнае значэнне. Калі Ленін садзіўся на паравоз для нелегальнага праезду праз фінляндскую граніцу, ён некалькі разоў паўтарыў, каб сшытак захавалі ва што-б там ні стала. Далей ён даваў указанні, каб у выпадку яго арышту сшытак быў перадан таварышу Сталіну.

Матэрыялы па падрыхтоўцы кнігі «Государство и революция» маюць самі па сабе выключную каштоўнасць. Яны захоўваюць усё сваё значэнне і пасля таго, як гэтыя матэрыялы, хоць і ў няпоўнай меры, выкарыстаны Леніным для стварэння геніяльнай работы «Государство и революция». Заметкі Леніна—адзіны ў сваім родзе зборнік найбольш важнага і значнага, што было напісана па пытанню аб дзяржаве і дыктатуры пролетарыята Марксам і Энгельсам, выкананы пры гэтым з усёй той навуковай добрасумленнасцю і старанасцю, якая характэрна для Леніна. Матэрыялы асабліва каштоўны паясненнямі, заўвагамі, якія Ленін дае ў сувязі з цыціруемымі ім вытрымкамі з работ асновапаложнікаў марксізма.

Адзначым яшчэ адну характэрную рысу падрыхтоўчых работ Леніна к «Государству и революции». Тут Ленін адводзіць душу, гаворачы аб апартуністах. Рэволюцыйным гневам, жгучай нянавісцю супроць скажэння і апошлення марксізма насычана гэта работа.

Так, напрыклад, робячы крытычныя заўвагі па поваду палемікі Каўцкага з Панекукам, Ленін спярэшчвае старонкі свайго сшытка наступнымі заўвагамі па адрасу Каўцкага: «Подлы Карл Каўцкі», «перл рэфармізма», «перл ідыятызма». У тых выпадках, калі Каўцкі ўжо вельмі ляўна займаецца гнусным скажэннем марксізма, Ленін не вытрымлівае і літаральна піша: «Жулік і падлец!!».

Агульны вывад, які Ленін робіць па поваду скажэнняў марксізма з боку Каўцкага, наступны: «Гэта — поўны крах марксізма!! Усе ўрокі і вучэнні Маркса і Энгельса 1852—1891 забыты і скажаны. «Разбіць ваенна-бюракратычную дзяржаўную машыну» вучылі Маркс і Энгельс. Ні слова аб гэтым. Дыктатура пролетарыята падменена мяшчанскай утопіяй барацьбы за рэформы. Социялізм па-рэфармісцку ажыццяўляецца; масавая стачка для рэформ — да гэтага усё зводзіцца. Ні слова аб барацьбе супроць «забабоннай веры ў дзяржаву», аб стварэнні пролетарыятам не парламенцкіх, а «працуючых, выканаўчых і законадаўчых» прадстаўнічых установаў... няма ні пропаведзі рэволюцыі, ні распрацоўкі яе пытанняў».

Насычаныя рэволюцыйнай страсцю і гневам супроць скажальнікаў марксісцкага вучэння, заметкі Леніна ўзбройваюць нас у барацьбе з усякага роду варожымі цэлямі і тэорыямі.

Н. МАРКАЎ.

Карціна мастака Герасімава «В. І. ЛЕНІН». Фото Ласкутова (СФ).

* * *

Соцыялістычная і буржуазная дэмакратыя

Пасля з'яўлення марксава «Капітала» ніякія хітраванні абаронцаў наймовага рабства ўжо не маглі скрыць факт эксплаатацыі пролетарыята буржуазіяй. Пасля з'яўлення ленінскай работы «Государство и революция» ніякія хітрасплясценні не ў стане затушаваць гіганцкую прынцыпіяльную перавагу соцыялістычнай дэмакратыі перад дэмакратыяй буржуазнай.

Пошлае проціпастаўленне «дэмакратыі» наогул — «дыктатуры» наогул служыла і да гэтага часу служыць зброяй у руках ворагаў соцыялізма. Ленін паказаў усю недарэчнасць і бязглуздасць гэтага проціпастаўлення.

Дзяржава існуе не ў беспаветранай прасторы, а ў класавым грамадстве. Дэмакратыя — толькі форма дзяржавы. Няма і не можа быць «чыстай дэмакратыі». Спевакі гэтай апошняй на справе ўспяваюць буржуазную дэмакратыю, затушоўваючы яе класавы характар. Між тым буржуазная дэмакратыя немінуча мае надзвычай абмежаваны характар. Яна сціснута цеснымі рамкамі капіталістычнай эксплаатацыі. Яна астаецца ў сутнасці дэмакратыяй для меншасці. Працоўныя масы астаюцца на становішчы наймовых рабоў.

Дыктатура рабочага класа не азначае простага расшырэння дэмакратыі. Яна з'яўляецца прынцыпова новым, непараўнаўча больш высокім яе тыпам.

Па-першае, таму, што яна азначае сапраўднае ўцягненне ў кіраванне дзяржавай большасці, а затым і пагалоўна ўсіх працоўных. Па-другое, таму, што яна адкрывае шлях да знішчэння класавай эксплаатацыі і класаў наогул, шлях да комунізма.

Каб выканаць свае вялікія гістарычныя задачы, дыктатура рабочага класа павінна зламаць супраціўленне ранейшых паноў жыцця, развеяць ушчэнт іх рэстаўратарскія спробы, ліквідаваць эксплаататарскія класы цалкам. Яна не скрывае ні сваіх мэт ні метадаў іх ажыццяўлення. Яна прама і чэсна гаворыць: няма і не можа быць «роўнасці» паміж эксплаататарам і эксплаатуемым, няма і не можа быць «свабоды» для эксплаататараў пры ўладзе рабочага класа.

Геній Леніна раскрыў адрозненні, характар і змест соцыялістычнай дэмакратыі яшчэ да таго, як яе эра была адкрыта Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыяй. Дваццаць год існавання совецкай улады бліскуча пацвердзілі ленінскі аналіз.

Падагульваючы параўнанне пролетарскай і буржуазнай дэмакратыі, Ленін пісаў:

«Ітак: у капіталістычным грамадстве мы маем дэмакратыю ўрэзаную, убогую, фальшывую, дэмакратыю толькі для багатых, для меншасці. Дыктатура пролетарыята, перыяд пераходу да комунізма, упершыню дасць дэмакратыю для народу, для большасці, побач з неабходным падаўленнем меншасці, эксплаататараў. Комунізм адзін толькі ў стане даць дэмакратыю сапраўды поўную, і чым яна паўней, тым хутчэй яна стане непатрэбнай, адамрэ сама сабой».

Дыктатура рабочага класа забяспечыла беспаваротную перамогу соцыялізма ў СССР. Ліквідаваны ўсе эксплаататарскія класы. Створана новая, соцыялістычная эканоміка, даючая грамадзянам СССР усе магчымасці для заможнага і культурнага жыцця. Ажыццёўлена права на працу і адпачынак, на матэрыяльнае забеспячэнне пры хваробе і ў старасці, права на асвету для ўсіх грамадзян. Правы грамадзян СССР забяспечаны соцыялістычнай арганізацыяй усёй народнай гаспадаркі, няўхільным ростам прадукцыйных сіл совецкага грамадства, адстраненнем усякай магчымасці гаспадарчых крызісаў, ліквідацыяй беспрацоўя, скарачэннем рабочага дня, сістэматычным паляпшэннем матэрыяльнага становішча працоўных і іх культурнага ўзроўню і т. д.

Жанчыны, моладзь, чырвонаармейцы і камандзіры, грамадзяне ўсіх нацыянальнасцей СССР карыстаюцца аднолькавымі правамі. Свабода слова, друку, сходаў, мітынгаў, дэманстрацый забяспечваецца прадастаўленнем у распараджэнне арганізацый працоўных друкарань, запасаў назапашаных, грамадскіх будынкаў і інш. матэрыяльных умоў для ажыццяўлення прадастаўленых свабод.

Сталінская Канстытуцыя расшырае базу дыктатуры рабочага класа, упягвае ў кіраванне совецкай дзяржавай новыя слаі працоўных.

Новы совецкі выбарчы закон з'яўляецца самым дэмакратычным выбарчым законам у свеце. Усе яго артыкулы праследуюць адну задачу: забяспечыць правядзенне ў жыццё Сталінскай Канстытуцыі, гарантаваць усім грамадзянам СССР выкарыстанне іх праў і выкананне грамадзянскіх абавязкаў у поўным аб'ёме.

* * *

У той самы час, калі ў СССР адбываецца росквіт соцыялістычнай дэмакратыі, буржуазія ў радзе краін адкінула фігавы лісток буржуазнай дэмакратыі і перайшла да адкрытай, агалцелай фашысцкай дыктатуры. Пераход ад буржуазнай дэмакратыі да фашызма — гэта не простая змена аднаго ўрада другім. Гэта — змена дзяржаўнай формы буржуазнага ўладарства, змена метадаў, пры дапамозе якіх буржуазія кіруе.

Фашысты са свайго боку «наводзяць крытыку» на буржуазную дэмакратыю; але гэта напамінае «крытыку» кватэры наведаўшымі яе грамілямі. Самыя змрочныя старонкі сярэдневяковай гісторыі бляднеюць перад зверствамі фашысцкіх грамілі. Яны ўтопчваюць у кроў і грязь усе дасягненні чалавечай культуры, яны ўзраджаюць у грамадстве норавы дзікіх звяроў. Яны ажыццяўляюць рэжым бяспраўя і сваволля ўнутры краіны і вядуць палітыку злачынных крывавых авантур звонку. Варта толькі ўспомніць італа-германскія зверствы ў Іспаніі, японскую авантуру ў Кітаі, якія заўтра-ж могуць паўтарыцца ў любым іншым пункце.

Тэндэнцыя да рэакцыі, непарыўна звязаная з імперыялізмам, была падмечана Леніным шчэ задоўга да з'яўлення фашызма. Фашызм увасабляе буржуазную рэакцыю ў яе самым зверскім, заалагічным, гнусным выглядзе. У гэтай абстаноўцы рабочы клас буржуазных краін, і перш за ўсё яго комуністычны авангард, выступае застрэльшчыкам усенароднага адпору рэакцыі і фашызму. Буржуазную дэмакратыю, як яна ні палавінчата і ўбога ў параўнанні з дэмакратыяй соцыялістычнай, рабочы клас грудзьмі абараняе ад фашысцкага мракабесся і людаедства.

Совецкі Саюз узняў высока пад светам сцяг сапраўднай, соцыялістычнай дэмакратыі. Да яго звернуты надзеі і спадзяванні ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва. Вакол яго збіраюцца ўсе сілы, здольныя даць адпор сучасным людаедам. Яго існаванне — магутны бар'ер, аб які разбіваюцца мутныя хвалі фашызма. Грозным абвінаваўчым актам супроць фашызма з'яўляецца Сталінская Канстытуцыя. Яна служыць «маральнай дапамогай і рэальным падспор'ем для ўсіх тых, хто вядзе зараз барацьбу супроць фашысцкага варварства». (Сталін).

П. ЧЭРЭМНЫХ.

М. МІЦІН

ГЕНІЯЛЬНАЕ ТВАРЭННЕ

Кніга «Государство и революция» — праграмны дакумент ленінізма, дакумент сусветна-гістарычнага значэння. Кожная мысль і слова гэтай работы насычаны велізарным зместам, з'яўляюцца абагульненнем рэволюцыйнага вопыту рабочага класа ўсяго свету. Гэта — адна з тых работ, у якіх, словам весна, а мыслям прасторна. Яе змест адрозніваецца зусім выключным багаццем.

Ленін не толькі адпаўляе погляды Маркса і Энгельса па пытанню аб дзяржаве. Ён прадаўжае і развівае вучэнне марксізма ў цэлым і галоўнае ў ім — вучэнне аб дыктатуры пролетарыята.

* * *

У сваёй кнізе «Государство и революция» Ленін паказвае перш за ўсё, у чым заключаецца сутнасць марксісцкага вучэння аб дзяржаве. Гэта было надзвычай важна зрабіць, бо якраз самыя асноўныя пункты гэтага вучэння былі апошлены і апаганены апартуністамі.

Марксізм даказваў, што дзяржава ёсць прадукт і праяўленне непрымірымасці класавых супярэчнасцяў, орган класавага панавання, прыгнечання аднаго класа другім. Апартуністы, поллае скажаючы Маркса, прапаседвалі, што дзяржава ёсць орган прымірэння класаў. Марксізм вучыў, што пастаяннае войска і паліцыя — галоўныя сродкі сілы дзяржавы, сродкі гвалту ў эксплаататарскай дзяржаве над эксплаатуемымі. Апартуністы-ж падтрымлівалі армію, прыкрываючы ў 1914—1917 гг. «... абарону грабежніцкіх інтарэсаў «сваёй» буржуазіі фразамі аб «абароне бацькаўшчыны», аб «абароне рэспублікі і рэволюцыі» і т. пад.!» [1])

Марксізм даказваў, што буржуазная дзяржава, у якой-бы форме яна ні выступала, няхай гэта будзе манархія або рэспубліка, уяўляе сабой сродкі гвалту капіталістаў над працоўнымі, незначнай меншасці над эксплаатуемай большасцю. Рэфармісты і апартуністы, прытупляючы рэволюцыйнае вастрыё марксісцкага вучэння, цвярдзілі на ўсіх перакрыжаваннях, што ў буржуазнай дзяржаве ўсеагульнае выбарчае права можа даць і дае сапраўдную магчымасць выявіць волю ўсяго насельніцтва, што і без разбурэння дзяржаўнай машыны буржуазіі, на аснове простага колькаснага накаплення рэформ, можна будзе прыйсці к соцыялізму, што ніякага рэволюцыйнага, гвалтоўнага ніззвяржэння буржуазіі не патрабуецца.

Маркс і Энгельс адтачыў сваю рэволюцыйную ідэйную зброю па пытанню аб дзяржаве ў барацьбе на два франты — з анархістамі і з усякага роду апартуністычнымі скажэннямі. У барацьбе з анархістамі Маркс і Энгельс падкрэслівалі, што пролетарыяту патрэбна дзяржава і што гэта дзяржава павінна быць яго дыктатурай, што без і па-за дыктатурай пролетарыята рабочы клас не зможа выканаць свайго гістарычнага назначэння. У барацьбе з апартуністамі Маркс і Энгельс падкрэслівалі, што пролетарская дзяржава, дыктатура пролетарыята стварае ўсе прапасылкі і ўмовы для адмірання дзяржавы толькі пасля пабудовы комунізма.

Гэтыя ясныя мысліі Маркса і Энгельса асабліва скажаліся апартуністамі. Яны прабавалі даказаць, што мірна і спакойна адмірань будзе існуючая буржуазная дзяржава.

З найвялікшай сілай Ленін раскрыў усе гэтыя махінацыі і хітрыкі адкрытых і скрытых ворагаў марксізма. Ён паказаў ўсе падлогі і скажэнні, якімі карысталіся рэфармісты і апартуністы для таго, каб затушаваць рэволюцыйныя погляды марксізма па пытанню аб дзяржаве.

З класічнай яснасцю Ленін вызначае сутнасць марксізма: «Галоўнае ў вучэнні Маркса ёсць класавая барацьба. Так гаворыць і пішуць вельмі часта. Але гэта не верна. І з гэтай нявернасці скрозь і ўсюды атрымліваецца апартуністычнае скажэнне марксізма, падробка яго ў духу прыемлемасці для буржуазіі. Бо вучэнне аб класавай барацьбе не Марксам, а буржуазіяй да Маркса створана і для буржуазіі, наогул кажучы, прыемлема... Абмяжоўваць марксізм вучэннем аб барацьбе класаў — значыць урэзаць марксізм, скажаць яго, зводзіць яго к таму, што прыемлема для буржуазіі. Марксіст толькі той, хто распаўсюджвае прызнанне барацьбы класаў да прызнання дыктатуры пролетарыята. У гэтым самае глыбокае адрозненне марксіста ад дзюжыннага дробнага (ды і буйнага) буржуа. На гэтым асялку трэба выпрабоўваць сапраўднае разуменне і прызнанне марксізма...» [2])

Кніга «Государство и революция» нанесла рашаючы ўдар па апартуністычнаму скажэнню марксізма, яна падвергла апартунізм і анархізм поўнаму ідэйнаму разгрому. Ужо адно гэта ўяўляе сабой справу сусветна-гістарычнага значэння. Аднак роля і значэнне работы Леніна «Государство и революция» гэтым далёка не вычэрпваецца.

* * *

Ленін дае выключны па глыбіні аналіз развіцця поглядаў марксізма па пытанню аб дзяржаве. Найвялікшым гістарызмам прасякнута ўся яго работа. Ленін паказвае, як Маркс і Энгельс, сапраўдчыя вялікія рэволюцыянеры і правадыры пролетарыята, следуючы метаду матэрыялістычнай дыялектыкі, старанна вывучалі вопыт масавага руху і рэволюцый. Яны нічога не будавалі на падставе толькі лагічных разважанняў, а вучыліся ў масавага руху, на вопыце мас. Асвятленне з пункту гледжання глыбокага філасофскага светапогляду сапраўднага гістарычнага развіцця падзей і жывога вопыту гісторыі прыводзіла Маркса і Энгельса кожны раз да новых вялікіх адкрыццяў. Ленін многа разоў прапісціваць падыход Маркса і Энгельса, якія ўмелі вучыцца і вучыліся ў мас з вагу руху і аналізавалі ўсе яго вынікі, педантычаму, глыбока апартуністычнаму падыходу, выяўленаму, напрыклад, Плехановым, які пасля снежаньскага ўзброенага паўстання 1905 года па-ліберальнаму крычаў: «Не трэба было брацца за зброю».

Ленін дае наступную карціну развіцця марксісцкіх поглядаў на пытанне аб дзяржаве.

У першых, як ён указвае, творах «зрэлага марксізма», напрыкладі рэволюцыі 1848 года, у «Нищете философии» і «Коммунистическом Манифесте» Маркс і Энгельс пакуль яшчэ ў агульным выглядзе фармулююць ідэю дыктатуры пролетарыята ў выглядзе палажэння: «дзяржава, гэта значыць арганізаваны ў пануючы клас пролетарыят».

На працягу 1848—1851 гг. Еўропа, а асабліва Францыя, перажывае цэлы рад буйнейшых рэволюцыйных падзей. Маркс у сваёй геніяльнай рабоце «Восемнаццатое брюмера Луи Бонапарта» даў непераўзыйдзены аналіз гэтых падзей з пункту погляду матэрыялістычнага разумення гісторыі. І вось, указвае Ленін, у «Восемнаццатом брюмере Луи Бонапарта», у пытанні аб дзяржаве «Марксім робіць велізарны крок наперад у параўнанні з «Коммунистическим Манифестом». Маркс на падставе вопыту падзей 1848—1851 гадоў прыходзіць да вываду, што ўсе ранейшыя рэволюцыі ўдасканалілі дзяржаўную машыну, а яе трэба разбіць, зламаць. Рэволюцыя пролетарыята павінна канцэнтраваць усе сілы разбурэння супроць буржуазнай дзяржаўнай улады.

У вядомым пісьме да Вейдэмейера ад 5 сакавіка 1852 г. Маркс паглыбляе гэту пастаноўку пытання і высоўвае пытанне аб неабходнасці рэволюцыйнага пераходнага перыяда, дыктатуры пролетарыята. Іменна ў гэтым, па словах Леніна, «...па-першае, галоўнае і карэннае адрозненне яго вучэння ад вучэння перадавых і найбольш глыбокіх мыслічэляў буржуазіі, а па-другое, сутнасць яго вучэння аб дзяржаве» [3]).

Нарэшце, наступным буйным крокам наперад у развіцці марксісцкага вучэння аб дзяржаве з'яўляецца ўлік вопыту Парыжскай Комуны 1871 года. Ленін указвае, што ў 1852 годзе з усёй строгай навуковасцю, якой прытрымліваўся Маркс, можна было толькі канстатаваць, што пролетарская рэволюцыя падышла да задачы сканцэнтраваць усе сілы для разбурэння дзяржаўнай машыны буржуазіі, але яшчэ не было матэрыялу для адказу на пытанне аб тым, чым замяніць дзяржаву буржуазіі.

Маркс, не ўдаючыся ва ўтопію, чакаў ад вопыту масавага руху адказу на пытанне, чым замяніць старую дзяржаўную машыну. І вопыт Парыжскай Комуны гэты адказ даў.

Велічэ Маркса і Энгельса заключаецца ў тым, што яны сумелі атрымаць асноўны і важнейшы урок Парыжскай Комуны. Гэты ўрок састаяў у тым, што парыжскія працоўныя ў сваёй барацьбе супроць рэакцыі пачалі стварэнь новую дзяржаву, «паўную» форму пролетарскай, соцыялістычнай рэспублікі.

Абагульваючы ўсё тое новае, што ўнёс Ленін у развіццё марксісцкага вучэння аб дзяржаве, таварыш Сталін пісаў:

«Асноўную ідэю дыктатуры пролетарыята, як палітычнага панавання пролетарыята і як метада звяржэння ўлады капіталістаў шляхам гвалту, далі Маркс і Энгельс. Новае ў Леніна заключаецца ў гэтай галіне ў тым, што: а) ён адкрыў Совецкую ўладу, як дзяржаўную форму дыктатуры пролетарыята, выкарыстаўшы для гэтага вопыт Парыжскай Комуны і рускай рэволюцыі; б) ён раскрыў дужкі ў формуле дыктатуры пролетарыята пад кутом погляду праблемы аб саюзніках пролетарыята, вызначыўшы дыктатуру пролетарыята, як асобую форму класавага саюза пролетарыята, з'яўляючагася кіраўніком, з эксплаатуемымі масамі непролетарскіх класаў (сялянства і інш.), з'яўляючыміся кіруемымі; в) ён падкрэсліў з асаблівай сілай той факт, што дыктатура пролетарыята з'яўляецца вышэйшым тыпам дэмакратыі пры класавым грамадстве, формай пролетарскай дэмакратыі, выражаючай інтарэсы большасці (эксплаатуемых),—у процівагу дэмакратыі капіталістычнай, выражаючай інтарэсы меншасці (эксплаататараў)».

Ідэі Леніна, развітыя ў яго кнізе «Государство и революция», вытрымалі вялікую гістарычную праверку.

Рэфармізм і апартунізм у рабочым руху, карэнні і сутнасць якога былі з такой здзіўляючай яснасцю раскрыты Леніным, прарабіў сваю далейшую эвалюцыю. Усімі сваімі карэннямі ён урос у буржуазную дзяржаву. Апартунізм правіў сябе як адзін з надзейнейшых устояў буржуазнага панавання. Сваёй здрадніцкай палітыкай расколу радоў рабочага класа апартуністычныя лідэры соцыял-дэмакратыі праклалі ў радзе краін шляхі агалцелай, варварскай, тэрарыстычнай дыктатуры фашызма.

Фашысцкая дзяржава прападала прадметны ўрок парламенцкім крэтынам і соцыял-дэмакратычным дурачкам. Цяпер увесь свет навочна ўбачыў, што ўяўляе сабой дыктатура буржуазіі, да чаго прыводзіць шлях расколу рабочага класа і адмаўлення адзінства яго дзеяння.

Адкрытая Леніным у «Государстве и революции» Совецкая ўлада, як форма дыктатуры пролетарыята, атрымала сваю праверку ў міжнародным маштабе. За гэтыя баявыя гады рабочы клас атрымаў велізарныя ўрокі з вопыту Баварскай і Венгерскай совецкіх рэспублік.

Надзвычайны трыумф святкуе ленінскае вучэнне аб дыктатуры пролетарыята і аб совецкай дэмакратыі ў сувязі з перамогай соцыялізма ў нашай краіне. На шляхах, прадказаных Леніным, у прыватнасці ў яго кнізе «Государство и революция», рабочы клас нашай краіны пад валадзіцельствам таварыша Сталіна, прадаўжаецеля справы Леніна, пабудаваў соцыялізм — першую фазу комунізма.

У жаркіх баях з аспервянелымі ворагамі ленінізма таварыш Сталін не толькі адстаяў ва ўсёй чыстаце ленінскае вучэнне аб дыктатуры пролетарыята, але развіў яго далей прымяняльна да новых умоў класавай барацьбы, да новага этапу соцыялістычнай рэволюцыі, значна абагаціў яго змест.

[1]) В. І. Ленін. Твор. т. XXI, стар. 376.

[2]) В. І. Ленін, Творы, т. XXI, стар. 392.

[3]) В. І. Ленін, Твор. т. XXI, стр. 392.

Усе матэрыялы, прысвечаныя 20-год. работы Леніна «Государство и революция», друкуюцца з «Правды» за 20 жніўня.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

10 ИН. ТУТ
Т. И. ПРАВА

СЕННЯ У НУ

ЫКУЛЫ:
давы — Ленінская тэорыя, ператвораная ў
ЦАЦЬ ГОД РАБОТЫ ЛЕНІНА «ГОСУ-
ВО И РЕВОЛЮЦИЯ»:
ніцін — Геніяльнае тварэнне.
Маркаў — Як нараджалася «Государство и
ция»
П. Чэрэмных — Социялістычна
дэмакратыя — 2 стар.
Д. Осіпаў — Фашызм і дзяржа
Звярнуць кожнаму калгаснікуз
заную прысядзібную зямлю. 1 с
Да новага навучальнага года:
М. В-ы — Навесці парадак у
раёна — 3 стар.

Звярнуць кожна
незаконна адрэзаную п

ПРАВІЦЬ ПАМЫЛКІ

ыя раёны Мозырскай округі не-
а аднесліся да надзялення калгас-
прысядзібнымі ўчасткамі. У Ельскім,
віцкім і Нараўлянскім раёнах, у пра-
і гэтай важнейшай работы дапу-
шмат памылак.
водках, якія маюцца ў округовым
ым аддзеле, 714 калгаснікам На-
кага раёна, патрэбна данарэзаць
бныя ўчасткі, а данарэзалі ўсяго
лгаснікам. Тут ёсць намеры недарэ-
лгаснікам той колькасці зямлі,
ны мелі раней, хоць плошча яе не
ала максімальнай нормы. Напрык-
1934 годзе калгаснік сельгасарцелі
Кастрычніка», Міхалкоўскага сель-
Касуха, меў 0,40 гектара прыся-
а ўчастка, а зараз яму нарэзалі
ектара. Касуха некалькі разоў ха-
ардзіцца ў райземаддзел і нічога не
ывялася, зараз у Ельскім раёне
ся да 300 калгасных гаспадарак,
маюць нават мінімальнай нормы
ібы.

ВЫКАНАЦЬ ПА
СНК СССР І Ц

У 1929 годзе аднаасобнікі пасёлкаў «Культура» і «Піч». Дудзіцкага сельсовета (Смілавіцкі раён), аб'ядналіся ў калгас імя Комвуза Беларусі. К таму часу кожны з калгаснікаў меў прысядзібны ўчастак па 0,75 гектара. Такімі сядзібамі яны карысталіся да 1935 года.

У 1935 годзе сядзібы былі абрэзаны да 0,33 га. Гэта было зроблена па-школьніцку, незаконна, бо згодна пастановы НКЗ СССР і Сельгасаддзела ЦК ВКП(б) для калгаснікаў Смілавіцкага раёна максімальная норма прысядзібных участкаў вызначана ў 0,60 гектара, значыць калгасны двор можа мець прысядзібны ўчастак у размеры да 0,60 га.

Пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў калгасным упарадкаванні» калгаснікі сустрэлі з вялікай радасцю. Яны, у прыватнасці, спадзяваліся, што ім будзе звернута незаконна адрэзана[illegible] 400 гектараў на

Але,
ную п
меюць.
мовілі.
прадст
скаргу
цы ад
—
гэтай
нельга,
ўчаст
значан
рэзвал
Гэта
пастан
раёне.
гаснік
двароў
калга
Ск
на п

МЕНСКАГА РАЁНА

Мільённая армія школьнікаў праз некалькі дзён запоўніць тысячы школ Совецкага Саюза. Хутка пачынаецца навучальны год.

Кожны год да гэтага дня райана і школы старанна рыхтуюцца. На-жаль, не так абстаіць справа ў школах Менскага раёна.

Караліщанская школа дагэтуль не мае дырэктара і педагогаў па асноўных дысцыплінах: па беларускай, рускай і польскай мовах, па гісторыі, геаграфіі і матэматыцы, а таксама двух настаўнікаў для малодшых класаў. З 20 жніўня толькі пачаўся рамонт школы. Школа не забяспечана апалам. З абстаючымі вучнямі нічога не было зроблена.

Не лепш абстаіць справа з новадворскай школай, дзе таксама няма педагогаў па матэматыцы, рускай мове і беларускай літаратуры.

Але самае асноўнае, што кіраўніцтва школай знаходзіцца ў руках несовецкага чалавека—ярага антысеміта. Усімі сіламі Трус стараўся выжыць з школы двух выкладчыкаў-яўрэяў, усяк здзекуючыся з іх на працягу навучальнага года. Будучы дырэктарам школы і з'яўляючыся членам сельсовета, ён прысвоіў забраную ў калгасніка карову. Калі да гэтага дадаць, што гэты чалавек не карыстаецца аўтарытэтам у насельніцтва, то пытанне стане зусім ясным.

Некалькі год падрад Караліщанскі сельсовет узнімаў пытанне перад Менскім РВК аб адкрыцці VIII класа пры НСШ у вёсцы Сінело, але РВК да гэтага пытання астаўся глухім і нямым. У вёсцы ёсць 22 вучні, кончыўшыя VII клас і жадаючыя працаваць вучобу ў школе.

Гэтыя акалічнасці ўлічыў сельсовет, але добрыя пажаданні сельсовета разбіваюцца аб непрыступную сцяну роўнадушша кіраўнікоў РВК.

Трэба сказаць, што менскі РВК (старшыня т. Жарын) наогул мала цікавіцца школьнымі справамі. РВК не прадухіліў зрыву 1936-37 навучальнага года і пасіўны да падрыхтоўкі ў гэтым годзе.

Гэтак-жа абстаіць справа з адкрыццём яшчэ аднаго камплекта пры лошыцкай пачатковай школе, дзе рост дзяцей школьнага ўзросту настойліва патрабуе пашырэння школы. Не мала загадчык школай Ясінскі спісаў паперы па гэтаму пытанню, але ўсё дарэмна.

Незразумела бясклопатнасць райана ў заканчэнні рамонту гэтай школы. Менскі райана ў самы разгар рамонту чамусьці адазваў з гэтай школы рабочых.

Ва ўказаных вышэй школах у гэтым годзе, як і ў мінулыя гады, змяняецца склад настаўнікаў на 50—90 проц. Чым вытлумачыць такую цякучасць? Выключна злачыннымі адносінамі райана і дырэктароў да совецкіх настаўнікаў. У райана настаўцкі ніколі не маглі з Вадэйка пагутарыць аб сваіх патрэбах—ён заўсёды пакладаўся на дырэктароў і загадчыкаў школ (сярод якіх ёсць нямала падхалімаў), а тыя на мясцах пытаннямі жыцця і быту настаўнікаў не цікавіліся.

Мы ўзялі для ілюстрацыі толькі некалькі школ Менскага раёна, на прыкладзе якіх відаць становішча ўсіх школ раёна.

Трэба тэрмінова ўзяцца за навядзенне парадку ў школах раёна і ў першую чаргу ў самім райана.

М. В—ы.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ „ЗВЯЗДЫ"

ДЗІЎНАЯ ПАЗІЦЫЯ МАЗЫРСКАГА АКРУГКОМА

21 ліпеня г. г. у газеце «Звязда» была надрукавана карэспандэнцыя «Антыпартыйныя справы ельскіх кіраўнікоў». У гэтай карэспандэнцыі былы сакратар Ельскага райкома партыі абвінавачваўся ў непартыйных адносінах да МТС, здзеках над яе дырэктарам — маладым вылучэнцам тав. Сікорскім, а таксама ў абароне трацкістаў.

На гэтыя сур'ёзныя сігналы друку Мазырскі акругком партыі, членам якога, між іншым, з'яўляўся і сакратар Ельскага райкома, спачатку адмоўчваўся. Толькі праз тыдзень сакратар акругкома тав. Ананьеў парашыў заняцца карэспандэнцыяй, аднак не з мэтай большэвіцкага рэагавання на факты, а для таго, каб выгарадзіць сакратара райкома.

«Праверка» фактаў, указаных у карэспандэнцыі, была даручана былому рэдактару акруговай газеты Гольдшварцу. Апошні раніцой выехаў у Ельск, а вечарам таго-ж дня прадставіў у бюро акругкома праект пастановы, у якім адвергнуў усе абвінавачванні сакратара райкома. Больш таго, віна была перакладзена на дырэктара МТС тав. Сікорскага. Маладому вылучэнцу, выкрываўшаму сакратара райкома, як апекуна трацкістаў, было прад'яўлена абвінавачанне ў адрыве ад райкома і процідзейстаўленні сябе партыйнаму кіраўніцтву. Як не дзіўна, але бюро акругкома на сваім паседжанні 1 жніўня прыняла гэты праект без адзінай папраўкі. Замест таго, каб даць большэвіцкую ацэнку фактам, указаным у карэспандэнцыі, глыбока і ўсебакова праверыць палітычны твар сакратара райкома, акругком абмежаваўся толькі ўказаннем **«на нерашучасць з боку райкома ў канчатковым вырашэнні пытання адносна трацкістаў такіх-та...»** Такое гніла-ліберальнае рашэнне акругкома з'яўляецца вельмі дзіўным.

Дзіўную пазіцыю заняў Мазырскі акругком і ў адносінах рэагавання на карэспандэнцыю «Дзіўны нейтралітэт», надрукаваную ў «Звяздзе» 2 ліпеня. Як вядома, у гэтай карэспандэнцыі абвінавачваліся Мазырская акруговая газета і яе рэдактар Гольдшварц у нежаданні выкрываць ворагаў. Апрача таго, Гольдшварц выкрываўся ў карэспандэнцыі як пасобнік ворагам.

Здавалася-б, што акругком павінен быў літаральна назаўтра-ж прыняць неабходныя меры, каб пазбавіць газету ад такога рэдактара. Аднак, больш тыдня справа з рэагаваннем на карэспандэнцыю адцягвалася. Потым, нарэшце, акругком «адважыўся» і вынес рашэнне аб адхіленні Гольдшварца ад рэдагавання газеты.

Але і гэта яўна ліберальнае рашэнне акругкома (пытанне аб партыйнасці Гольдшварца пакінута адкрытым) было вынесена па сутнасці фармальна. Гольдшварцу забаранілі толькі падпісваць газету, а фактычна ён па-ранейшаму да апошніх дзён выконваў абавязкі рэдактара.

Не лішне будзе сказаць у святле ўсіх гэтых фактаў і аб палітычнай глухапе акругкома да сігналаў комуністаў, адносна сувязей асобных акруговых работнікаў з выкрытымі ворагамі. У прыватнасці, акругком нічога не робіць у напрамку ўсебаковай глыбокай праверкі палітычнага твара загадчыка акрземаддзела тав. Патапенкі і выконваючага абавязкі культпропа акругкома тав. Кулінковіча. Аб гэтых людзях, як аб натуральніках ворагам, комуністы гаварылі яшчэ ў пачатку чэрвеня на другой акруговай партканферэнцыі. Але голас комуністаў не дайшоў яшчэ да слуху кіраўнікоў акруговай партарганізацыі.

АГІТАТАР КАЗЛОЎ

Калі ў полк прыбыло новае папаўненне, камандзіры і палітработнікі адразу-ж узяліся за палітычнае выхаванне маладых байцоў, бо многія з іх былі слаба развіты палітычна, не ведалі элементарных пытанняў міжнароднай і ўнутраной палітыкі. Для правядзення сярод байцоў прапагандысцка-агітацыйнай работы ў падраздзяленнях палка вылучаліся лепшыя агітатары.

Малодшаму камандзіру комсамольцу **Казлову** была даручана група маладых чырвонаармейцаў у колькасці 22 чалавек. З вялікім жаданнем і ахвотай узяўся Казлоў за выкананне даручанай яму работы. Ён пастаўіў перад сабой задачу падрыхтаваць палітычна маладых байцоў, каб яны маглі разбірацца ў міжнароднай і ўнутраной абстаноўцы, у бягучым палітычным жыцці.

Спачатку Казлоў арганізаваў сярод чырвонаармейцаў вывучэнне Сталінскай Канстытуцыі і даклада таварыша Сталіна на VIII надзвычайным з'ездзе Советаў. Гэту работу ён праводзіў у форме жывых гутарак, скарыстоўваючы ў якасці дапаможнага матэрыялу геаграфічныя і палітычныя карты, плакаты і дыяграмы.

Усёй душой аддаўся агітатар Казлоў сваёй рабоце. Людзі, якія прыехалі з вёскі, праяўлялі вялікую актыўнасць, яны жадалі зедаць аб усім, асабліва аб падзеях у Іспаніі, аб поспехах совецкай авіяцыі, аб вялікім будаўніцтве ў нашай краіне. Тав. Казлоў шукаў адказаў на ўсе пытанні байцоў. У вольны час ён накіроўваўся ў чытальню палка. Перачытваў там газеты, журналы, рабіў неабходныя запісы, а вечарам ішоў у чырвонаармейскі інтэрнат і там да позніх гадзін гутарыў з байцамі.

Тав. Казлоў усвоіў добрае правіла: ён ніколі не ўхіляецца ад заданых пытанняў, не стараецца абыспі іх. Калі яму адразу не ўдаецца адказаць на ўсе пытанні, ён адкладвае іх на другі дзень, каб, падрыхтаваўшыся, даць байцам вычарпальныя тлумачэнні.

Чырвонаармейцы часта просяць Казлова расказаць ім аб замыслах фашыстаў, аб ваенных падзеях у Іспаніі і Кітаі. У такіх выпадках агітатар збірае байцоў ля карты і пачынае весці э імі гутарку, паказваючы межы капіталістычных дзяржаў, іх геаграфічнае размяшчэнне і т. д.

Мінуў год вучобы. Байцы, з якімі працаваў тав. Казлоў, палітычна выраслі, пашырылі свой кругазор, сталі актыўнымі. На інспектарскай праверцы, якая нядаўна адбылася ў палку, усе 22 байцы групы агітатара Казлова здалі залікі па палітычнай падрыхтоўцы на добра і выдатна.

Агітатар Казлоў служыць у Чырвонай Арміі ўжо тры гады. Ён не толькі баец, агітатар, але і актыўны комсамольскі работнік. Казлоў нядаўна выбран членам палкавога бюро ЕСМ.

КАЛГАНАЎ.

ПАЛІТДЗЕНЬ ПА ПЫТАННЮ АБ ВЫБАРАХ

ВІЦЕБСК. Партыйная арганізацыя швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» разгортвае сярод рабочых палітычна-агітацыйную работу па вывучэнню палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

15 жніўня на фабрыцы па гэтаму пытанню быў праведзен спецыяльны палітдзень. На сходах рабочых у гэты дзень прысутнічала 700 чалавек. Рабочыя праяўлялі выключную зацікаўленасць новым выбарчым законам. Рыхтуючыся да палітдня, партарганізацыя сабрала ў пэхах ад рабочых 300 пытанняў на тэму ад прадстаячых выбарах. Трэба адзначыць даволі цікавае мерапрыемства завадской шматтыражкі. Яна ва сваіх старонках давала адказы на пытанні рабочых па новаму выбарчаму закону. (БЕЛТА).

У чыіх руках абаронная работа ў Гомелі?

На гомельскім камбінаце «Спартак» асоавіяхімаўская арганізацыя амаль зусім не працуе.

Старшынёй таварыства Асоавіяхім на камбінаце «Спартак» «працуе» Філікоўскі, членамі—Жлобінскі, Мяркулаў, Апіпенка і інш.

Філікоўскі за шэсць месяцаў 1937 года ні аднаго разу не сабраў пасяджэння фабрычнага совета Асоавіяхіма. Заявы рабочых аб уступленні ў члены Асоавіяхіма больш як поўгода валяюцца ў скрынках сталоў неразгледжанымі, а шэсць заяў зусім згублены. У пэхавага арганізатара мяккага пэха Жлобінскага таксама ляжыць многа заяў аб уступленні ў Асоавіяхім, якія на працягу 4-х месяцаў не разгледжаны. Не лепш пастаўлена справа ў карамельным і бісквітным пэхах. Для гуртка «варашылаўскіх коннікаў» закупілі сёдлы і па гэту мэту выдаткавалі тысячу рублёў. Але справа з месца не рушылася.

Рабочыя камбіната на справаздачна-перавыбарчым сходзе люта крытыкавалі фабком за дрэнную арганізацыю абароннай работы. Але-ж фабком не ўлічыў гэтага. Ён і зараз бяздзейнічае. На сваіх шматлікіх пасяджэннях фабком ні разу не ставіў пытанняў абароннай работы.

Бюракраты, чыноўнікі з гомельскага Совета Асоавіяхіма гадамі не бываюць на прадпрыемствах. Там заселі людзі, думаючыя больш аб грошах, чым пра абаронную работу. Варта толькі пераступіць парог гомельскага Совета Асоавіяхіма і заікнуцца, што патрэбны патроны або інструктар для арганізацыі работы Асоавіяхіма на прадпрыемстве, то ўсе работнікі ў адзін голас крычаць: «Грошы прынёс, давай, а потым будзем гутарыць з вамі». Усё гэта выклікае вялікую пазаронасць.

Далей такую бяздзейнасць цярпець немагчыма. Гомельскі гарадскі камітэт партыі павінен прыглядзецца да работы гомельскага Совета Асоавіяхіма.

ГРЫНЬКО.

Рэдактар шматтыражкі камбіната «Спартак»

Здзекуюцца з стаханаўкі

Я працую на гомельскай швейнай фабрыцы «Комінтэрн» больш сямі год. Адной з першых перайшла на стаханаўскія металы работы. Працую на двух варштатах.

Фабрыка вярнулася з водпуску. У часе водпуску быў праведзен рамонт на фабрыцы. І вось мае дзве машыны чамусьці паставілі ў цёмным месцы, прычым адлегласць паміж варштатамі — 1 метр. У рэзультаце мне проста немагчыма працаваць: цёмна, і ад цеснаты збіваюцца локці рук.

Апрача таго каля маіх машын паставілі прасы. Каля ног ляжаць тры гарачыя трубы ад прасоў. Цесна і душна. З гэтай прычыны я выконваю толькі чвэрць нормы, і затрымліваю работу ўсяго пэха. Гэта ў той час, калі раней я была перадавой стаханаўкай і па пэху выконвала норму больш за ўсіх.

Так паступілі са мной таму, што я адважылася напісаць пра непарадкі на нашай фабрыцы ў адпаведныя арганізацыі. Дырэктар фабрыкі Каган раззлаваўся і рашыў адпомсціць. Інакш расцаніць гэтага нельга, бо ў пэху ёсць свабодныя месцы, дзе можна было-б паставіць варштаты.

Калі я звярнулася да дырэктара фабрыкі т. Кагана, ён мне груба адказаў: «Не можаш працаваць — звальняйся». Звярнулася я ў фабком, але там паўтарылі тое-ж, што сказаў дырэктар.

Х. З. ДВОРКІНА,

работніца гомельскай швейнай фабрыкі «Комінтэрн».

Тры гады будуюць школу

Яшчэ ў 1935 годзе ў калгасе «Совецкая Беларусь», Ельскага раёна, пачата будаўніцтва клуба і лазні. Агульны сход калгаснікаў ухваліў пастанову праўлення калгаса аб водпуску патрэбных сродкаў.

Для будаўнічага матэрыялу разбурылі некалькі гумнаў. Але-ж, паклаўшы 5 вянкоў, работу адклалі да наступнага года.

У 1936 годзе зноў пачалі будаўніцтва, зноў разбурылі некалькі гумнаў. Толькі далей раскідання старых гумнаў работа не пайшла. Зруб астаўся гнісці пад дажджом да 1937 года. Нарыхтаваны матэрыял для будаўніцтва расцягнулі на дровы.

Зараз у калгасе выбрана новае праўленне (старшыня т. Бензэ), якое таксама ігнаруе пастанову схода, нічога не робіць, каб закончыць пабудову такіх ачасоў культуры, як клуб і лазня.

П. А. ГУЛЕВІЧ.

„Маланка" падарожніца

7 мая гэтага года памёр мой бацька. Мне вельмі пажадана было, каб усе браты і сёстры разам пахавалі бацьку. Для гэтага я пайшоў на Менскую гарадскую тэлеграфную станцыю і адправіў тэлеграму-маланку ў м. Круглае, дзе жывуць мае родзічы. Адправіўшы маланку, я стаў чакаць прыезду родзічаў. Але марнымі былі мае чаканні. Яны не прыехалі.

Я ніяк не мог дадумацца, з якой прычыны гэта здарылася. Аднак пасля некаторага часу мне ўдалося выявіць, што маланка прыбыла ў Круглянскае аддзяленне сувязі 7 мая ў 18 гадзін 55 мінут і прынята была тав. Шэдкіным. Замест таго, каб пераслаць маланку нарачным, Шэдкін перадаў яе пюферу, які раз'язджае на аўтамашыне з м. Круглае ў калгасы. Шофер, прыехаўшы ў калгас, перадаў маланку брыгадзіру калгаса, а той у сваю чаргу перадаў яе адрасату толькі праз чатыры дні, г. зн. 10 мая. Так хадзіла тэлеграма-маланка.

Такія безадказныя і бяздушныя адносіны з боку працаўніку Наркомсувязі вельмі злзіўляюць мяне. Гэта, безумоўна, з'яўляецца вынікам безадказнага кіраўніцтва з боку Упаўнаважанага Наркомсувязі.

СЫЧОЎ.

Здзекі з рабочых

Дырэктар Белэнергабуда Розін бюракратычна адносіцца да запатрабаванняў рабочых, палепшання іх бытавых умоў. Шмат разоў рабочыя скардзіліся Розіну на запушчанасць інтэрната і інш., але ён і слухаць не хоча і ніякіх мер не прымае.

У пакоях інтэрната песната, бруд, сцены сырыя, са столі цячэ. Пасцельная бялізна зусім не мяняецца. Ідзеш з работы а ў інтэрнат заварачацца не хочацца. Трамвайных білетаў рабочым не даюць, і ім прыходзіцца за пяць кілометраў хадзіць пеша на работу. Камендант у інтэрнаце рэдка бывае, а калі і бывае, то не хоча прыслухоўвацца да скарг рабочых. Зарплату рабочыя атрымліваюць заўсёды са спазненнем.

РУДЗІНСКІ.

Д. ОСІПАЎ

ФАШЫЗМ І ДЗЯРЖАВА

Фашызм яшчэ не нарадзіўся як палітычная плынь, калі Ленін пісаў «Государство и революцию»; аб фашысцкай дзяржаве і аб «тэорыі» яго не было тады і паміну. Самае слова «фашызм» з'яўляецца ў Леніна ўпершыню толькі ў 1921 годзе.

Пасляваенная атмасфера была напоўнена буржуазна-дэмакратычнай траскатнёй. Ва ўсіх кутках Еўропы наспех перакрайваліся або нанава ствараліся дэмакратычныя канстытуцыі найноўшых фасонаў. Народным масам, змораным страшэннай імперыялістычнай бойняй, згаладаўшымся, раздражоным, упіралі цяпер ачкі архідэмакратычнай славеснасцю. Больш усіх стараліся па гэтай часці социял-дэмакратычныя партыі, якім патурала буржуазія. Аднак, ашукаць рабочы клас не ўдалося. Еўропа палала рэволюцыйнымі паўстаннямі, і глеба траслася пад пануючымі класамі.

Фашызм нарадзіўся ў гэтых пасляваенных бурах. Ён вырастаў па меры таго, як абазначалася бяссілле буржуазна-дэмакратычнага ашуканства. Рабочы клас рашуча выходзіў з-пад уплыву социял-дэмакратычных агентаў капітала. Але ён быў недастаткова моцны, каб, перамогшы здраду социял-дэмакратыі, разбіць класавага ворага і авалодаць уладай.

Таварыш Сталін гаварыў на XVII з'ездзе партыі, што «перамогу фашызма ў Германіі трэба разглядаць не толькі як адзнаку слабасці рабочага класа і вынік здрад социял-дэмакратыі рабочаму класу, расчысціўшай дарогу фашызму. Яе трэба разглядаць таксама, як адзнаку слабасці буржуазіі, як адзнаку таго, што буржуазія ўжо не ў сілах уладарыць старымі метадамі парламентарызма і буржуазнай дэмакратыі, з прычыны чаго яна вымушана прыбегнуць ва ўнутраной палітыцы да тэрарыстычных метадаў кіравання...»[1])

Фашысцкія «тэарэтыкі» прабуюць прадставіць фашысцкую дзяржаву як зусім новы від дзяржавы, як нешта такое, што процістаіць усім існаваўшым да гэтага часу буржуазным дзяржавам. Яны называюць фашысцкую дзяржаву «карпаратыўнай», «тотальнай». У ёй няма парламента або асталося ад яго параднае прадстаўленне, у якім дэпутаты не выбраныя, а назначаныя, выконваюць ролю статыстаў, а адзіны ўрачысты маналог гаворыць галава дзяржавы. У гэтай дзяржаве скасавана поўнасцю ўсякае падабенства грамадзянскай і палітычнай роўнасці. Бясспраўе — гэта асноўны закон фашысцкай дзяржавы. Усе яе жыхары бяспраўны перад тварам свайго пана ніспасланага містычным провідзеннем «фюрэра».

У фашысцкай дзяржаве быццам-бы знішчана класавая барацьба, таму, што, ці-ж бачыце, скасаваны класы. Замест іх існуюць карпарацыі, у якіх капіталісты і рабочыя выступаюць аднолькава як «вытворцы». Дзяржава быццам-бы глядзіць на іх па-апякунску зверху, прымяраючы іх процілеглыя інтарэсы. У фашысцкай дзяржаве ўсякі прыватны інтарэс, — хай будзе гэта інтарэс капіталіста або рабочага, памешчыка ці батрака, — быццам-бы падпарадкаван вышэйшаму дзяржаўнаму інтарэсу, містычным законам «расы».

Гэта наглая, беспардонная хлусня выкрываецца зверскай эксплаатацыяй пролетарыята ў фашысцкіх дзяржавах, бязмежным сваволлем капіталістаў, бязлітасным крывавай расправай з лепшымі сынамі рабочага класа. Разнузданая нацыяналістычная дэмагогія не можа прыкрыць ісціну: фашызм — гэта адкрытая тэрарыстычная дыктатура найбольш рэакцыйных, найбольш шавіністычных і найбольш імперыялістычных элементаў фінансавага капітала... Гэта не новы від дзяржавы, а новы зід дыктатуры буржуазіі. Не будучы ў стане ўтрымаць сваю дыктатуру старымі метадамі буржуазнай дэмакратыі, капітал прыбягае да новых сродкаў ашуканства.

Фашысты не скрываюць, што ў аснове іх дзяржаўнай улады ляжыць голы гвалт. Яны прабуюць асвяціць гэты гвалт прыкладамі з фальсіфікуемай імі гісторыі. Агіднасці цяперашняй сваёй палітыкі яны апраўдваюць агіднасцямі старыны. Ліберальная дыктатура буржуазіі румяніцца дэмакратычнымі фарбамі. Фашысцкая дыктатура буржуазіі прыціраецца фарбамі антычнага Рыма і сярэдневяковай Германіі. Паплечнікі Гітлера разгрываюць фарс найноўшага Тэўтонскага ордэна. Яны хочуць усю Еўропу перакроіць па фасонах таго часу, калі кучка «благародных рыцараў» на чале з магістрам ордэна разбойнічала на вялікіх дарогах, грабіла сялян, вешала і чэтвертавала непакорлівых, бясчынствавала ў гарадах, прысвайвала агнём і мечам землі ў Прыбалтыцы, Літве і Польшчы.

Гэта — маскарад, не толькі бескарысны, але і глупы. Капіталістычных магнатаў фашысцкай Германіі, дырэктароў банкаў і каралёў трэстаў ніяк немагчыма выдаць за благачэсцівых старшын рамесніцкіх цэхаў сярэдневякоўя. Таксама-ж ніяк не сойдзе за «благародных рыцараў» тая сволач, якую вярбуюць сабе ў дапамогу фашысцкія правіцелі па вобразу і падабенству апісанага Марксам у «Васемнаццатым брумера Луі Банапарта» чорнасоценным «Обществе десятого декабря». Там «побач з агалцелымі авантурыстамі з буржуазіі... сустракаліся брадягі, адстаўныя салдаты, выпушчаныя на свабоду крымінальныя злачынцы, беглыя катаржнікі, машэннікі, фігляры...» і т. д., аж да ўтрымальнікаў публічных дамоў і кішэнёвых злодзеяў.

Фашызм — гэта адкрытая тэрарыстычная дыктатура найбольш рэакцыйных, найбольш шавіністычных і найбольш імперыялістычных элементаў фінансавага капітала... Гэта не новы від дзяржавы, а новы зід дыктатуры буржуазіі. Не будучы ў стане ўтрымаць сваю дыктатуру старымі метадамі буржуазнай дэмакратыі, капітал прыбягае да новых сродкаў ашуканства.

Фашысты не скрываюць, што ў аснове іх дзяржаўнай улады ляжыць голы гвалт. Яны прабуюць асвяціць гэты гвалт прыкладамі з фальсіфікуемай імі гісторыі. На-манапалістычны капіталізм, паказвае незвычайнае ўзмацненне «дзяржаўнай машыны», нечуваны рост яе чыноўніцкага і ваеннага апарата ў сувязі з узмацненнем рэпрэсій супроць пролетарыята як у манархічных, так і ў самых свабодных, рэспубліканскіх краінах[2])».

Адкінуўшы ўсякія дэмакратычныя ўпрыгожанні і пэрамоніі, фашызм даводзіць да крайніх прадзелаў дзеянне буржуазнага апарата падаўлення пролетарыята. Гвалт над прапоўнымі набывае агідныя рысы раз'юшанага, бесчалавечага белага тэрора. Трусасць параджае лютасць, а фашызм жыве ў вечным страху перад рабочым класам. Фашызм — адзнака слабасці буржуазіі. Фашысцкія кіраўнікі ўсведамляюць сваю слабасць, і адсюль іх заўсёды панічны стан, трывога, у якой яны трымаюць і сваю краіну, і ўсю Еўропу, і ўвесь свет.

Фашызм жыве нянавісцю да пролетарыята. Калі-б ён мог, ён знішчыў-бы ўсіх рабочых. Фашысцкія раманы не выпадкова фантазіруюць аб «рабоце», аб бяздушным аўтамаце, які выконваў-бы ўсе фізічныя работы, не патрабуючы хлеба і не думаючы аб паўстанні. Фашызм баіцца ўсяго, што звязана з пролетарыятам, з яго тэорыяй, з яго мараллю. У барацьбе фашысцкіх правіцеляў з марксізмам ёсць прымесь зжікіх забабонаў. Яны верань, што можна знішчожыць марксізм, знішчожыўшы на агні творы Маркса. Таксама-ж фашызм баіцца слоў «класавая барацьба». Гэтыя словы нельга вымаўляць. Яны выгнаны з падручнікаў, з друку, з літаратуры. Яны абвешчаны д'ябальскім насланнем.

Адсюль смяротны страх перад Совецкім Саюзам і смяротная нянавісць да яго. Атоленая дыктатура буржуазіі не пераносіць дзяржавы рабочых і сялян. Яна не прабуе ўцешыць самое сябе ці ашукаць свае масы дэмакратычнымі адгаворкамі. Маскі скінуты. Дыктатура буржуазіі паказвае свету адкрыта сваё звярынае аблічча.

Выканаўчая ўлада ўсюды, ва ўсіх буржуазных дзяржавах пасляваеннага часу выпясняе парламенцкія ўстановы, абмяжоўвае дэмакратыю. Гэтую рысу буржуазнай дзяржавы эпохі імперыялізма адзначае Ленін у «Государстве и революции». «Дыктатура буржуазіі» скразіць паўсюль праз шчыліны і дзіры, утвораныя ўзмацненнем выканаўчай улады. Усё-ж яна яшчэ маскіруецца. У фашызме выканаўчая ўлада буржуазіі канчаткова ліквідуе парламенцкія шырмы. Дыктатура буржуазіі знаходзіць сваё дасканалае выражэнне ў дыктатару. Фашысцкая «тэорыя» паслужліва творыць належную ідэалагічную абалонку. Прыдумваецца містычная тэорыя ніспасланых народу провідзеннем «фюрэраў», закліканых загадваць. Агалашаецца догмат «падпарадкавання» мас. Народ павінен быць пакорным. У гэтым яго вызначэнне. У гэтым яго вялікае шчасце. І калі ён яго ўсё-ж не адчувае, то сотні тысяч фашысцкіх дружыннікаў, складаючых дзяржаўную машыну кіравання, могуць вельмі простымі сродкамі давесці любога скептыка да непрытомнага стану.

Цэнтралізацыя дзяржаўнай улады, усё больш з'ядаючая аўтаномію, самакіраўніцтва асобных вобласцей ва ўсіх буржуазных дзяржавах, у фашысцкіх краінах ператварыла дзяржаву ў страшэннага бюракратычнага спрута з чыноўнічымі шчупальцамі. Фашысцкая дыктатура буржуазіі не прызнае ніякіх самакіруючыхся вобласцей, ніякіх нацыянальных рэспублік, акруг. Усё падвяргаецца ўніфікацыі фашызма: гістарычныя вобласці і жывыя народы.

Фашысцкая дыктатура буржуазіі імкнецца падпарадкаваць сабе і суседнія краіны, і чужыя народы. Прафесары ўніверсітэтаў, з якіх выгнана свабоднае навуковае даследаванне, паслужліва прыпадносяць дыктатару невуцкую і бязглуздую «расавую тэорыю». Пад флагам выдуманай перавагі «паўночнай расы» апраўдваецца разбойніцкае сваволле невялікай кучкі банкаўскіх магнатаў. Негерманскія народы абвяшчаюцца «гноем» для «германцаў», але і сапраўдны германскі народ гэта таксама гной для ўтабжэння «фюрэраў».

Непамерны ўсёпажыраючы рост ваеннага апарата—абавязковы спадарожнік дыктатуры буржуазіі ў яе агаленай форме. Фашызм пераўтварае ўсю дзяржаву ў ваенны апарат. Грамадзянскае насельніцтва робіцца простым прыдаткам да арміі. Вайна адкрыта абвяшчаецца асноўнай мэтаю дзяржаўнага існавання. Гітлер праведвае ў сваёй кнізе «Мая барацьба», што працяглы мір разбэшчвае народы. Толькі працяглая бесперапынная вайна выхоўвае моцныя характары. Так гаворыць вуснамі фашысцкага дыктатара сама дыктатура буржуазіі, якая не можа існаваць, не рыхтуючы вайны супроць рабочага класа, не знішчаючы лепшых яго сыноў, не топячы ў крыві ўсякую спробу яго барацьбы за сваё жыццё.

Фашызм зрабіў дзяржаву ваеннай дзяржавай. Ён стварыў сярод Еўропы разбойніцкі ўзброены лагер, які стаў перш за ўсё пагрозай для буржуазных суседзяў.

Дыктатура буржуазіі, якая фарсіць ў «дэмакратычным» рызэі, крывіцца спалохана на фашысцкую дыктатуру буржуазіі, якая трымае сябе цынічна і груба, атрэсіўна хуліганіць і не жадае прызнаваць ніякіх дыпламатычных прыстойнасцей. Фашысцкія дзяржавы ўжо распалілі ваенны пажар, ён пагражае перш за ўсё цэласці і незалежнасці больш слабых дзяржаў. Шукаючы свайго ўласнага выратавання і не верачы ў сілу сярэдневяковага маскарада, фашысцкія правіцелі гатовы ў акіяне народнай крыві патушыць усе заваяванні сусветнай культуры. Фашысцкія дзяржавы сталі сусветнай небяспекай.

Выкрываючы ўсякую буржуазную дзяржаву, як форму дыктатуры буржуазіі, Ленін указваў у «Государстве и революции», што для пролетарыята зусім не абыякава форма, у якую апранаецца дыктатура буржуазіі ў пэўных гістарычных умовах. Ленін напамінаў, што «дэмакратыя мае велізарнае значэнне ў барацьбе рабочага класа супроць капіталістаў за сваё вызваленне»[3]). Пролетарыят гатоў падтрымаць і падтрымлівае і буржуазную дэмакратыю супроць фашызма, каб выкарыстаць яе для сваёй ўласнай барацьбы і для арганізацыі ўсіх прапоўных у імя барацьбы за мір. Пролетарыят сражаецца на любым бар'еры, перагароджваючым шлях крываваму фашызму, яго шалёным планам знішчэння мільёнаў прапоўных у імя панавання германскіх, італьянскіх, японскіх капіталістаў над светам. Узнімаючы сцяг сапраўднай дэмакратыі, пролетарыят усяго свету разгортвае выпрабаваны ў баях чырвоны сцяг пролетарскай дыктатуры.

[1]) І. Сталін «Пытанні ленінізма», стар. 545.

[2]) В. І. Ленін. Творы, т. XXI, стар. 391.

[3]) В. І. Ленін. Творы, т. XXI, стар. 438.

АНТЫСОВЕЦКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ ЯПОНЦАЎ У ШАНХАІ

ШАНХАЙ, 19 жніўня. (БЕЛТА). У ноч на 17 жніўня, карыстаючыся тым, што генеральнае консульства СССР у Шанхаі аказалася на тэрыторыі, кантралюемай японскімі войскамі, японскія салдаты пад выглядам таго, што ў адным пакоі консульства, нібыта, гарэла электрычнае святло, прабавалі насільна ўварвацца ў памяшканне консульства, якое было эвакуявана супрацоўнікамі. У памяшканні знаходзіліся толькі два кітайцы, прыватнік і кулі. Апошнія, маючы ўказанні нікога з пастаронніх у будынак не пускаць, адмовіліся адчыніць дзверы японскім салдатам. Шыбы дзвярэй і акон былі разбіты салдатамі, але пранікнуць у памяшканне яны не паспелі, бо к гэтаму часу прыехаў кіраўнік генеральнага консульства тав. Сіманскі, якому было паведамлена карэспандэнтам ТАСС тав. Рогавым аб тым, што японскія войскі пагражаюць бамбардыраваць памяшканне консульства.

Цікава адзначыць, што японскія ўлады не палічылі патрэбным звярнуцца непасрэдна ў генеральнае консульства, а палічылі за лепшае звярнуцца да карэспандэнта ТАСС, які не мае да гэтага ніякага дачынення.

Японскія салдаты, кіруемыя афіцэрам і грамадзянскай асобай, якая назвалася супрацоўнікам японскага консульства Іноуе, накінуліся на кітайскіх служачых і, не гледзячы на пратэсты, сілай вывелі іх з памяшкання і забралі з сабой. Раніцой на наступны дзень тав. Сіманскім быў заяўлен рашучы пратэст японскаму генеральнаму консулу Окамото супроць самаўпраўства і парушэння японскімі салдатамі міжнародных звычаяў (гвалтоўнае ўтрыманне ў консульства і вывад з экстрытарыяльнага памяшкання служачых замежнага консульства). У пратэсце тав. Сіманскім было заяўлена таксама, што з прычыны гвалтоўнага пазбаўлення японскімі ўладамі аховы памяшкання консульства і знаходжання яго на тэрыторыі, кантралюемай японскімі войскамі, уся адказнасць за цэласць усяго консульства ляжыць на японскай старане.

Окамото ў контрпратэсце імкнуўся стварыць версію, што электрычнае святло ў адным з пакояў пустога будынка консульства, нібыта, было запалена «з мэтай сігналізацыі ворагу», г. зн. кітайскай старане.

Тав. Сіманскі катэгарычна адверг ні на чым не абгрунтаванае сцвярджэнне і заявіў, што ёсць усе падставы сцвярджаць наўмыснасць правакацыі з боку антысовецкіх элементаў, якія дабіваюцца ўсімі спосабамі стварыць чарговую правакацыю, як гэта мела месца ў Цяньцзіне ў часе налёту і разграблення консульства СССР па ўказанню японскіх разведчых органаў. 19 жніўня служачыя консульства, кітайскія падданныя Ян Цзу-луп (57 год — непісьменны) і Ян А-пу (19 год — непісьменны) былі выпушчаны. Згодна іх паказанням, яны падвяргаліся па некалькі раз у дзень допыту, які суправаджаўся безупыннымі збіццямі і пагрозай расстрэлу. За ўвесь час прабывання ў зняволенні і ў часе допыту арыштаваныя былі звязаны. Пры допытах высвятлялася размяшчэнне пакояў у консульстве, месцы размяшчэння сейфаў, прозвішчы і адрасы супрацоўнікаў, а таксама — хто наведвае консульства, што было вывезена з консульства і т. п. Абодвум была абяцана ў выпадку дачы неабходных вестак буйная грашовая ўзнагарода. Ні адно пытанне аб так званай «сігналізацыі» задана не было. Перад вызваленнем абодвух сілай прабавалі прымусіць падпісаць нейкую паперу, напісаную на японскай мове, на якой быў нарысован план консульства. Пасля адмаўлення падпісаць гэту паперу іх зноў пачалі люта збіваць і сілай прымусілі паставіць адбітак пальца.

Чарговая японская правакацыя на гэты раз не ўдалася. Аднак, няма ніякіх гарантый, што не будзе зроблена спроба пусціць у ход сфабрыкаваны пад пагрозай смерці дакумент або скарыстаць пакінутае без аховы памяшканне консульства для новай правакацыі ў стылі выдуманай «сігналізацыі».

СТАНОВІШЧА Ў ШАНХАІ

ШАНХАЙ, 19 жніўня. (БЕЛТА). У ноч на 19 жніўня японскія войскі пад прыкрыццём паветранай бамбардыроўкі прабавалі высадзіцца ў Пзючао (супроць раёна Путун) і Танцзявань, але былі вымушаны адступіць. У часе артылерыйскай перастрэлкі адзін снарад папаў у японскую кананерку.

Становішча на франтах змянілася наступным чынам: у раёне Янцзыпу японскія войскі адступілі на тэрыторыю міжнароднага сетльмента. На паўночным фронце ў Чапеі японскімі войскамі была прадпрынята агульная атака. Мост Бацзыпзяо пераходзіў з рук у рукі 5 раз, але ўсё-ж астаўся ў руках кітайскіх войск.

ПРАПАНОВА АНГЛІІ АБ НЕЙТРАЛІЗАЦЫІ РАЁНА ШАНХАЯ

ЛОНДАН, 18 жніўня. (БЕЛТА). Як перадае Рэйтэр, англійскім паслом у Токіо і Нанкіне дана інструкцыя зрабіць прапанову японскаму і кітайскаму ўрадам аб нейтралізацыі раёна Шанхая. Згодна прапановы Японія і Кітай павінны вывезці свае ўзброеныя сухапутныя і морскія сілы з Шаньхайскага раёна. Узамен Англія ўзяла-б на сябе адказнасць за абарону японскіх рэзідэнтаў пры ўмове супрацоўніцтва Францыі і Злучаных Штатаў. Вызначыць раён, які павінен быць нейтралізован, можна было-б шляхам мясцовых перагавораў.

Лічаць, — гаворыць далей агенцтва, — што гэта прапанова павінна выпрабаваць шчырасць японскага сцвярджэння, што японскія сілы дзейнічаюць у Шанхаі толькі для абароны жыцця і маемасці японскіх грамадзян.

ЕНІНА „ГОСУДАРСТВ

ВОСЬМЫ ЭТАП СОВЕЦКАГА ВЕЛАТУРУ

МАГІЛЕЎ, 20 жніўня (па тэлефону). У восьмым этапе совецкага велатуру Гомель — Магілеў (188 кілометраў) пацярпеў паражэнне лідэр туру Рыбальчанка. Выйграў гэты этап малады гоншчык Вяршынін (Наркамат абароны, Масква). Час яго — 6 гадзін 43 мін. 37 сек. Рыбальчанка прайграў яму 7 мінут. Бальшакоў (Менск — «Дылама») закончыў гэты этап у галоўнай групе. Па васьмі этапах ён на шостым месцы. Заслугоўвае пахвалы менскі гоншчык Максімаў (таварыства «Тэмп») закончыўшы восьмы этап вельмі блізка ад першых гоншчыкаў. 21 жніўня гоншчыкі стартуюць з Магілева ў Менск. У Менск яны прыбываюць у 4 гадз. 30 м. дня.

БОЙТЛЕР.

ЗНОЙДЗЕН АБЛОМАК МЕТЭАРЫТА

У Камарынскім раёне мясцовы жыхар Фама Дусёнак знайшоў на глыбіні метра вялікі камень, маючы аплаўленыя бакі і пакрыты жалезнай коркай. Аб гэтай знаходцы даведаліся прапуючыя ў раёне супрацоўнікі геалагічнай экспедыцыі Акадэміі навук БССР. Яны ўстанавілі, што гэты камень з'яўляецца абломкам метэарыта, час падзення якога пакуль цяжка вызначыць.

Як паведамілі ў Інстытуце геалогіі Акадэміі навук БССР 26 год таму назад у тым-жа Камарынскім раёне быў знойдзен абломак метэарыта, але некалькі меншага памеру.

У геалагічны музей Акадэміі навук БССР ужо дастаўлен знойдзены абломак метэарыта. Ён адносіцца да групы камяніста-жалезістых відаў. Вага яго каля 18 пудоў.

Цікава адзначыць, што пры набліжэнні да метэарыта магнітная стрэлка компаса адхіляецца ад нармальнага становішча на 90 градусаў.

Інстытут геалогіі запрасіў з Масквы спецыялістаў метэарытнай камісіі Акадэміі навук СССР для дадатковага вывучэння знойдзенага ў БССР абломку метэарыта.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ЦЭНТРАЛЬНЫ ФРОНТ

Згодна вестак іспанскага міністэрства абароны, 18 жніўня на ўсіх сектарах цэнтральнага фронта адбывалася лёгкая перастрэлка. На бок рэспубліканцаў перайшлі 6 салдат.

Каля Пуэбла-Нуэва агнём рэспубліканцаў знішчаны групы мяцежнікаў, якія накіроўваліся ў Себольо Монтэ Арагон.

УСХОДНІ (АРАГОНСКІ) ФРОНТ

Згодна вестак іспанскага міністэрства абароны, у сектары Тэруэля рэспубліканцы занялі важныя высоты і вёску Вільястар (за 8 кілометраў на поўдзень ад Тэруэля).

Пры ўзяцці 18 жніўня рэспубліканскімі войскамі гары Лос Сантос была падабрана вялікая колькасць вінтовак, ручных гранат, а таксама прапівагазаў, кінутых мяцежнікамі.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Мяцежнікі, карыстаючыся падтрыманнем вялікай колькасці самалётаў, танкаў і артылерыі, занялі ў сектары Сантандэра некалькі пазіцый, дзе ўзнялі італьянскі флаг. Рэспубліканскія войскі пасля бліскучай контратакі занялі пазіцыі Крус дэль Маркес. Паўторная спроба непрыяцеля прадпікнуць у даліну Рэйноса ў напрамку Тораладвега скончылася няўдачай.

Згодна вестак, атрыманых агенцтвам Эспань з надзейных крыніц, іспанскія мяцежнікі сканцэнтравалі на сантандэрскім фронце армію да 40 тысяч чалавек, у тым ліку італьянскую дывізію. Войскі мяцежнікаў маюць магутную артылерыю, у тым ліку цяжкую, у большасці германскай вытворчасці. У распараджэнні паўночнай арміі мяцежнікаў ёсць таксама да 50 бамбардыроўшчыкаў і знішчальнікаў. Усімі аперацыямі кіруе генерал Давіла, штаб якога складаецца амаль выключна з германскіх і італьянскіх ваенных спецыялістаў.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

Рэспубліканская авіяцыя 18 жніўня бамбардыравала размяшчэнне мяцежнікаў у Алфахарын і Вільяфранка дэ Эбро (на паўднёвы ўсход ад Сарагосы), дзе ў рэзультаце бамбардыроўкі ўзніклі пажары. У часе паветранага бою над Сарагосай адзін мяцежны самалёт быў збіт. (БЕЛТА).

ХВАЛЯВАННІ Ў ЛАГЕРЫ МЯЦЕЖНІКАЎ

ВАЛЕНСІЯ, 18 жніўня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення міністэрства абароны, у Сарагосе, на ўсходнім фронце, адбываліся баі ў лагеры мяцежнікаў. На рэспубліканскіх пазіцыях была чуваць узмоцненая перастрэлка. Фашыстская артылерыя, спыніўшы абстрэл рэспубліканскіх пазіцый, сканцэнтравала агонь на Сарагосе.

Мяцежнікі перакінулі ў Сарагосу рад часцей, знятых з раёнаў Кінто і Бельчыта. З акопаў мяцежнікаў раздаваліся галасы, запрашаўшыя рэспубліканскіх салдат выступіць разам супроць замежных захватчыкаў.

АДЗІНСТВА ДЗЕЯННЯЎ ПРАЦОЎНЫХ ІСПАНІІ

ВАЛЕНСІЯ, 19 жніўня. (БЕЛТА). На пасяджэнні ўсеіспанскага камітэта сувязі паміж комуністычнай і сацыялістычнай партыямі выпрацаваны асноўныя пункты сумеснай праграмы дзеяння абодвух партый. Гэта праграма, падпісаная прадстаўнікамі абодвух партый, разаслана ўсім нізавым арганізацыям абодвух партый і павінна служыць базай у іх штодзённай рабоце.

Выпрацаваная праграма прадугледжвае наступнае: умацаванне баявой магутнасці рэспубліканскай народнай арміі: стварэнне магутных вайсковых рэзерваў, сістэматычная чыстка армій ад агентаў мяцежнікаў; вылучэнне на камандныя пасты вызначыўшыхся салдат, арганізацыя адзінага камандвання ўсёй арміі і ўсімі франтамі; стварэнне магутнай ваеннай прамысловасці і павышэнне прадукцыйнасці ваенных заводаў; актыўная садзейнасць ураду ў пабудове ўмацаванняў на франтах і газазсхоў у тылу; садзейнасць ураду ў наладжванні работы транспарту для абслугоўвання фронта і тылу і т. д.

Далей праграма прадугледжвае прыняцце мер па паляпшэнню матэрыяльнага становішча працоўных, па паляпшэнню ўмоў працы і павышэнню іх культурнага ўзроўню.

У адносінах сялянства праграма патрабуе правядзення аграрнай палітыкі, стымулюючай павелічэнне сельскагаспадарчай прадукцыі і паляпшэнне матэрыяльнага ўзроўню працоўных сялян; забеспячэнне сялянам вольнага выбару калектыўнай ці аднаасобнай сістэмы апрацоўкі зямлі і т. д.

У праграме ўказваецца на неабходнасць правядзення харчоўнай палітыкі, якая-б забяспечвала ў першую чаргу харчаваннем байцоў на фронце, абучаемых вайсковых рэзерваў, транспартных рабочых і рабочых ваенных прамысловасці.

Праграма патрабуе правядзення мер, якія забяспечылі-б поўны грамадскі парадак на ўсёй тэрыторыі Іспанскай рэспублікі і ачысцілі-б тыл ад шпіёнаў і правакатараў.

Рад пунктаў праграмы прысвечан умацаванню народнага фронта, правядзенню палітыкі, якая забяспечвае адзінства прафсаюзных арганізацый і аб'яднанне ўсёй іспанскай рэспубліканскай моладзі.

Абедзве партыі рашылі дабівацца адзінства дзеянняў Комінтэрна, другога Інтэрнацыянала і Амстэрдамскага аб'яднання прафсаюзаў.

Асобны пункт праграмы падкрэслівае неабходнасць умацавання цеснай сувязі народаў Іспаніі з народамі Совецкага Саюза. Абедзве партыі лічаць, што абарона СССР — свяшчэнны абавязак не толькі сацыялістаў і комуністаў, але і ўсіх антыфашыстаў. Абедзве партыі будуць выкрываць ворагаў Совецкага Саюза, краіны сацыялізма.

АД МАГІЛЕЎСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

Згублены партыйны білет за № 875263, выданы Магілеўскім РК КП(б)Б на імя Стаскевіча Лукі Марыновіча, лічыць несапраўдным.

Сакратар Магілеўскага гаркома КП(б)Б. ХРЫПАЧ.

ДЗЁННІК

Нарада прапагандыстаў Кагановіцкага раёна г. Менска адбудзецца 21 жніўня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Дома тэхнікі.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ДЗЯРЖЦЫРК

Парк імя Горкага (тэл. 22-725).

Навінка спорту

Футбольны матч на веласіпедах выконваюць 7 МОРЭНО

Гастроль 2-ДЭРЫНГ

палёт на аэраплане.

Апошнія гастролі ЛЕО-МАРО 4 ДОРЭН

гімнасты на турніках і шмат іншых нумароў.

Пачатак у 9 г. вечара. Каса адкрыта з 10—2 і з 5—10 г. в.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Вел. дзярж. драм. тэатра т. 24-905 — 1) КАМЕННЫ ГОСЦЬ 2) «БАРЫШНЯ КРЕСТЬЯНКА»

Гастролі Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» НА ПАЎНОЧНЫМ ПОЛЮСЕ На летняй эстрадзе—канцэрт. адд.

Дзіцячы гукавы кінатэатр МЫ З КРАНШТАТА

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ На летняй эстрадзе—канцэрт. адд.

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» СЫН РЫБАКА

Гукавы кінатэатр «Спартак» НАЗАР СТАДОЛЯ

ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

МАГАЗІНАМІ №№ 1, 24, 28 МЕНСКАЙ КАНТОРЫ БЕЛПРАМГАНДЛЯ ВЫПУШЧАНЫ ДА ШКОЛЬНАГА БАЗАРА, які адкрыўся 20 жніўня ў парку імя Горкага (б. „Профінтэрн")

СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ, РОЗНЫЯ ШКОЛЬНЫЯ ПРЫЛАДЫ— СШЫТКІ, ДЗЕННІКІ, АЛОЎКІ, РУЧКІ, ПЕРА І ЎВЯЛІКІМ АСАРТЫМЕНЦЕ ДЗІЦЯЧЫ ТРЫКАТАЖ, АБУТАК, ГАТОВАЕ ПЛАЦЦЕ, ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ, БЯЛІЗНА, МЫЛА ТУАЛЕТНАЕ і розныя інш. ТАВАРЫ

ШКОЛЬНІКІ! усе на школьны БАЗАР!

УСЕ НА ШКОЛЬНЫ БАЗАР!

У парку імя Горкага (былы сад «Профінтэрн») абсталёван КНІЖНЫ КІЁСК

БЕЛАДДЗЯЛЕННЯ КОГІЗ'А.

ЁСЦЬ ВЯЛІКІ ВЫБАР ПАДРУЧНІКАЎ і ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ, а таксама сшыткі, пер'і, алоўкі і інш. школьна-пісьмовыя прылады.

Там-жа можна ПРАДАЦЬ па ўстаноўленай расцэнцы СКАРЫСТАНЫЯ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ.

ДА ВЕДАМА ДЫРЭКТАРОЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ВЫНАХОДЦАЎ

ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНЫЯ МАЙСТЭРНІ НАРКАММЯСЦПРОМА І БІЮРО ТЭХНІЧНАЙ КАНСУЛЬТАЦЫІ І КАНСТРУКТАРСКАГА АФАРМЛЕННЯ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ТЭХНІКІ Ў МЭТАХ САДЗЕЙНАСЦІ ВЫНАХОДНІЦТВУ

ПРЫМАЮЦЬ ЗАКАЗЫ на РАСПРАЦОЎКУ РАБОЧЫХ ЧАРЦЯЖОЎ ВЫНАХОДНІЦТВАЎ, ТЭХНІЧНЫХ УДАСКАНАЛЕННЯЎ, А ТАКСАМА НА ВЫРАБ МАДЭЛЕЙ І ПРАМЫСЛОВЫХ УЗОРАЎ АПОШНІХ, ПА ДАГАВОРАХ.

АДРАС: Г. МЕНСК, КОМСАМОЛЬСКАЯ, 25, ЦЭНТРАЛЬНЫ ДОМ ТЭХНІКІ.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

МЕНСКАЯ 2-гадовая ШКОЛА МЕДСЯСЦЁР абвяшчае НАБОР НА 1937—38 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Школа медсясцёр рыхтуе медыцынскіх сясцёр па догляду за хворымі.

У школу прымаюцца грамадзяне абодвага полу ад 15 да 35 год, якія маюць агульнаадукацыйную падрыхтоўку не ніжэй 7 класаў сярэдняй школы.

Усе паступаючыя ў школу падвяргаюцца прыёмовым іспытам па матэматыцы (арыфметыцы, алгебры, геаметрыі), фізіцы, геаграфіі, беларускай і рускай мовах і канстытуцыі

УВАГА. Грамадзяне, якія маюць пасведчанне аб сканчэнні 7 класаў сярэдняй школы па асноўных прадметах на выдатна, а па маляванню, чарчэнню, спевах, музыцы, фізкультуры не ніжэй чым на добра, прымаюцца без іспытаў.

ПРЫЕМ ЗАЯЎ ПРАЦЯГНУТ ДА 25 ЖНІЎНЯ.

Іспыты з 15 па 25 жніўня.

Да заявы неабходна прыкласці: а) атэстат аб сканчэнні НСШ (у арыгінале), б) метрычны выпіс, в) даведку аб стане здароўя, г) 2 фотакарткі, д) аўтабіяграфію і е) на 40 кап. паштовых марак.

Слухачы забяспечваюцца стыпендыяй згодна існуючых правіл. Інтэрнатам школа не забяспечвае, але выплачвае кватэрныя.

Дакументы накіроўваць па адрасу: г. Менск, Клінічны гарадок, школа медсясцёр.

Канцылярыя адкрыта з 9 да 5 гадзін дня.

ДЫРЭКЦЫЯ ШКОЛЫ.

ДА ВЕДАМА ТРЫМАЛЬНІКАЎ АБЛІГАЦЫЙ ДЗЯРЖАЎНЫХ УНУТРАНЫХ ПАЗЫК СССР

1 ВЕРАСНЯ 1937 ГОДА ЗАКАНЧВАЕЦЦА ТЭРМІН АБМЕНУ АБЛІГАЦЫЙ

раней выпушчаных пазык на аблігацыі пазыкі Другой Пяцігодкі (выпуск чацвертага года) у сувязі з праведзенай у 1936 годзе канверсіяй дзяржаўных унутраных пазык.

АБМЕНУ ПАДЛЯГАЮЦЬ АБЛІГАЦЫІ НАСТУПНЫХ ПАЗЫК: Трэцяй пазыкі індустрыялізацыі; пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады»; пазыкі Трэцяга рашаючага года пяцігодкі; пазыкі Чацвертага завяршаючага года пяцігодкі, пазыкі Другой Пяцігодкі (выпускаў першага, другога і трэцяга года).

К 1 ВЕРАСНЯ 1937 г. усе грамадзяне, якія маюць на руках аблігацыі пералічаных пазык, павінны абмяняць гэтыя аблігацыі ў ашчадных касах на аблігацыі пазыкі Другой Пяцігодкі (выпуск чацвертага года).

Грамадзяне, якія захоўваюць аблігацыі гэтых пазык у ашчадных касах, могуць абмяняць гэтыя аблігацыі пры асабістай яўцы, або шляхам пасылкі ў ашчадную касу пісьмовай заявы разам з захоўна-ссудным пасведчаннем.

Грамадзяне, якія падпісаліся на ўказаныя вышэй пазыкі, але не атрымаўшыя ў свой час на рукі аблігацый у сваім прадпрыемстве, установе, або сельскім совеце, павінны запатрабаваць аблігацыі і абмяняць іх на аблігацыі Пазыкі Другой Пяцігодкі (выпуск чацвертага года) у цэнтральнай, або раённай ашчаднай касе.

ПАСЛЯ 1-га ВЕРАСНЯ 1937 года УСЕ АБЛІГАЦЫІ РАНЕЙ ВЫПУШЧАНЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ УНУТРАНЫХ ПАЗЫК, ЯКІЯ ПАДЛЯГАЮЦЬ АБМЕНУ У СУВЯЗІ З КАНВЕРСІЯЙ, ТРАЦЯЦЬ МОЦ І АБМЕНЬВАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.

Галоўнае Кіраўніцтва дзяржаўных працоўных ашчадных кас і дзяржаўнага крэдыта.

МЕНСКАЯ ЗУБАЎРАЧЭБНАЯ ШКОЛА абвяшчае ПРЫЁМ НА АДНА ГАДОВЫЯ КУРСЫ ЗУБНЫХ ТЭХНІКАЎ.

Курсы рыхтуюць зубных тэхнікаў па каўчуку, металу і складаных зубных пратэзах.

На курсы прымаюцца грамадзяне ад 15 да 35 год.

Усе паступаючыя павінны трымаць іспыты за 7 класаў НСШ па беларускай і рускай мовах, матэматыцы і грамадазнаўству.

Заявы падаюцца на імя дырэктара школы з указаннем — на курсы зубных тэхнікаў, з наступнымі дакументамі: аўтабіяграфія, атэстат аб сканчэнні НСШ, даведка аб нарадзенні, дзве фотакарткі з уласнаручнымі подпісамі. Усе дакументы падаюцца ў арыгіналах. Стыпендыя 75 руб. у месяц. Інтэрнатам не забяспечваюцца, курсанты часткова забяспечваюцца кватэрнымі.

Прыём заяў да 1 верасня. Іспыты з 1 да 5 верасня.

Адрас: г. Менск, Першамайская, 7, зубаўрачэбная школа.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ПАТРАБУЮЦЦА для работы ў Менску ІНЖЫНЕР-ЛЕСАВОД, СТАРШЫЯ САДОЎНІКІ, БУХГАЛТАР-КАРТАТЭТЧЫК, ПРАДАЎШЧЫЦЫ КВЕТАК в латкоў.

Звяртацца: Менск, вул. Карла Маркса, 60, тэл. 24-231, Трэст зялёнага будаўніцтва.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ з 2 пакояў і кухні з усімі выгодамі ў Віцебску на кватэру ў Менску.

Даведацца: Менск, Інтэрнацыянальная, 6, медсанкіраўніцтва ЦК Чырвонага Крыжа, Свердлоў, з 10—4 г. дня. Віцебск, Калініна, 13/20, кв. 16, 3 паверх.

Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63.

Уп. Галоўлітбела № К—3021.

К., Б., Б.